WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 МАЯ 2010 г. СЕРАДА № 100 (26708)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.**

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | III квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

*Заставайцеся з намі!*

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ МІНШЧЫНЫ БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ РОСТУ ДАБРАБЫТУ БЕЛАРУСІ»

**Мінская вобласць павінна павысіць тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця, тым самым будзе ўмацаваны дабрабыт усёй Беларусі. Аб гэтым заявіў 25 мая кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, прадстаўляючы новага старшыню Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыса Батуру актыву Мінскай вобласці.**



Фота БЕЛТА.

«Я вельмі хачу, каб Мінская вобласць прыбавіла ў тэмпах. Нават у гэтым годзе, заклаўшы тым самым асновы для будучай пяцігодкі. Прыбавіць Мінская вобласць — значна рушыць наперад уся краіна. Бо Міншчына — гэта аснова, гэта вялікая тэрыторыя з добрымі землямі, вельмі добрымі людзьмі і вялікімі магчымасцямі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што змена губернатара Мінскай вобласці не мае якой-небудзь палітычнай падаплёкі. «Усе мы будзем нармальна працаваць у органах дзяржкіравання, калі ў нас будуць нармальныя вынікі ў эканоміцы. Эканоміка — гэта галоўнае для нас», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён заклікаў не шукаць элементы «надзвычайшчыны» ў ратацыі кадраў. «Па меры развіцця дзяржавы павінен ісці нармальны і натуральны працэс станаўлення і ўдасканалення кадравага патэнцыялу. Застой тут недапушчальны, яго быць не можа, таму што ён прывядзе, як прынята цяпер гаварыць, да стагнацыі, рэгрэсу і адкату назад», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння перад краінай стаяць адказныя задачы. «Як паказвае практыка, не ўсім яны пад сілу. Нехта не вытрымлівае напружанага рытму і сам пакідае пасаду, некаму не ўдаецца дасягнуць высокіх вынікаў, і даводзіцца яго перамяшчаць на іншыя пасады, каб не пагоршыць становішча на гэтым участку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы пра работу Леаніда Крупца на пасадзе губернатара, Прэзідэнт адзначыў, што ён не дапусціў эканамічнага абвалу, дастаткова спакойнай застаецца сацыяльна-палітычная абстаноўка ў рэгіёне. Вобласць нарэшце пераадолела двухмільённы рубеж збору збожжа, выконваецца пастаўленая задача па забеспячэнні Мінска прадуктамі харчавання. Аднак, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, няма дынамікі эканамічнага развіцця, і сёння неабходна павышаць эфектыўнасць вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Гаворачы аб цяперашніх кадравых рашэннях, ён таксама адзначыў, што «кадрам Міншчыны неабходны строгі і прынцыповы стыль кіраўніцтва».

Прэзідэнт упэўнены, што «тандэм губернатара Барыса Батуры і яго першага намесніка Валерыя Іванова ўяўляе сабой сплаў вопыту і маладосці, прызначаны вывесці Мінскую вобласць на лідзіруючыя пазіцыі ў многіх сферах». Перад новым кіраўніцтвам стаяць вельмі адказныя і напружаныя задачы, паколькі гэта асаблівы рэгіён, развіццё якога ў многім вызначае агульную дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. «Міншчына павінна быць прыкладам для ўсіх рэгіёнаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем адзначыў, што вытворчы патэнцыял Міншчыны, асабліва ў аграпрамысловым комплексе, рэалізуецца не ў поўнай меры. Вобласць пачынае страчваць тэмпы ў сваім сацыяльна-эканамічным развіцці. Падае эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці. «Вы паступова страчваеце лідзіруючыя пазіцыі і пераходзіце на другарадныя ролі ў краіне. Вядома, гэтага я дапусціць не магу», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дэталёва спыніўся на шэрагу недахопаў, над устараненнем якіх новаму кіраўніцтву вобласці давядзецца сур'ёзна папрацаваць. Прэзідэнт раскрытыкаваў тэмпы прамысловай вытворчасці ў вобласці. Па гэтым паказчыку ў мінулым годзе рэгіён займаў апошняе месца ў краіне. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што такі стан спраў не апраўдваюць аб'ектыўныя цяжкасці збыту прадукцыі, паколькі ў арганізацыях вобласці склаліся адны з самых нізкіх тэмпаў росту прамысловай вытворчасці. Паводле слоў Прэзідэнта, у гэтым годзе сітуацыя практычна не змянілася. «Я не раз падкрэсліваў, што вобласць не павінна трымацца на двух «кітах» — «Беларуськаліі» і БелАЗе. У рэгіёне працуе амаль 350 прамысловых прадпрыемстваў, і іх развіццём трэба займацца паслядоўна і сістэмна», — сказаў беларускі лідар, адзначыўшы, што за 4 месяцы гэтага года практычна чвэрць з іх знізілі аб'ём вытворчасці.

Адной з вострых праблем застаецца высокі ўзровень запасаў гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў (на 1 мая ён у 1,3 раза перавышае сярэднямесячны аб'ём вытворчасці). Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад новага кіраўніцтва вобласці павышанай увагі да вырашэння гэтай важнейшай задачы. Няпростай застаецца сітуацыя з фінансавым станам прадпрыемстваў, нізкая рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, не лепшым чынам ідуць справы з прыцягненнем інвестыцый.

СТАР. 2

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мікалая Дзямянцея з 80-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мікалая Дзямянцея з 80-годдзем, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Мікалай Дзямянцей — вядомы палітычны і грамадскі дзеяч. Працаваў на розных партыйных пасадах у Віцебскай вобласці, сакратаром ЦК КПБ, быў намеснікам старшыні Вярхоўнага Савета СССР, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. У пачатку 1990-х гадоў узначальваў Вярхоўны Савет БССР 12-га склікання. Менавіта пад яго старшынствам Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР.

## У ЧАЦВЕР УНАЧЫ МАГЧЫМЫЯ ЗАМАРАЗКІ

**Гэтымі днямі пад уплывам паветраных масаў з боку Балтыйскага мора ў нашай краіне пахаладае, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У чацвер атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў стане менш. Толькі ўначы ў Віцебскай вобласці і ўдзень на паўднёвым захадзе пройдуць невялікія дажджы. Вецер аслабее. Тэмпература ўначы 3—8 цяпла, месцамі па краіне магчымыя невялікія замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — ад плюс 14 па поўначы да 22 градусаў па поўдні краіны. **У пятніцу** атмасферны ціск зноў знізіцца і пройдуць ападкі; **на поўдні месцамі дажджы моцныя.** Тэмпература ўначы 7—13, удзень — 12—19, на поўдні — да 21 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## АХВОТА ГОРШ ЗА НЯВОЛЮ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Таль Любанскага раёна.

Прыёмная кампанія-2010

## КОНКУРСНАЯ СІТУАЦЫЯ ЗМЯНЯЕЦЦА НА КАРЫСЦЬ АБІТУРЫЕНТАЎ...

### У бліжэйшыя гады ВНУ будуць «змагацца» за ахвотнікаў атрымаць другую і трэцюю вышэйшую адукацыі

Надзея НІКАЛАЕВА

**Галоўнай адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі з'яўляецца адсутнасць прынцыповых зменаў у правілах прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміў журналістам начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Юрый МІКСЮК. Дарэчы, за першы тыдзень работы ў Міністэрстве адукацыі «гарачай» лініі сюды паступіла толькі 200 званкоў ад абітурыентаў. Гэта сведчыць пра тое, што «правілы гульні» пераважнай большасці абітурыентаў добра вядомыя...**

— Мы бачым сваю задачу ў тым, каб стварыць для абітурыентаў максімальна камфортныя ўмовы, таму да работнікаў прыёмных камісій прад'яўляем асаблівыя патрабаванні: на гэтым участку работы працуюць толькі сапраўдныя прафесіяналы, псіхалагічна падрыхтаваныя для работы з абітурыентамі, здольныя даваць кваліфікаваныя адказы і кансультацыі. Усе прыёмныя камісіі павінны працаваць па прынцыпе «аднаго акна», каб абітурыент мог атрымаць вычарпальную інфармацыю непасрэдна на месцы, — падкрэсліў Юрый Міксюк.

Усяго ў 2010 годзе на ўзровень вышэйшай адукацыі на ўсе формы атрымання адукацыі ў дзяржаўныя і прыватныя ВНУ запланавана прыняць 102,7 тысячы чалавек, што на 4,9 тысячы больш, чым у 2009 годзе, у тым ліку на дзённую форму навучання — 54,4 тысячы чалавек і 48,1 тысячы — на завочную. Пры гэтым колькасць выпускнікоў у гэтым годзе меншая амаль на 11 тысяч чалавек. Школы выпусцяць у дарослае жыццё ўсяго 88,2 тысячы чалавек. І ў наступныя чатыры гады колькасць выпускнікоў будзе змяншацца. Таму напрошваецца цалкам заканамернае пытанне: а ці не здарыцца так, што праз некалькі гадоў вышэйшая адукацыя стане даступнай усім ахвотным, асабліва тым, у каго ёсць сродкі, каб аплачваць сваё навучанне? Не сакрэт, што павелічэнне набору ажыццяўляецца пераважна за кошт платных месцаў. Калі план бюджэтнага набору павялічыўся ў гэтым годзе ўсяго на 854 месцы, то на ўмовах аплаты навучання дзяржаўныя ВНУ прымуць на 2,5 тысячы чалавек больш, чым у папярэднім годзе, а прыватныя ВНУ павялічваюць набор на 1,5 тысячы чалавек. Але ці патрэбна рынку працы столькі людзей з вышэйшай адукацыяй?

> **ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**
> *У 2009 годзе засталіся незапоўненымі 220 бюджэтных месцаў у ВНУ (40 — на дзённай і 180 — на завочнай форме навучання) і 215 месцаў — у ССНУ.*

— Нашай краіне патрэбны спецыялісты і з вышэйшай, і з сярэдняй спецыяльнай, і з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, — запэўніў Юрый Міксюк. — Таму мы спрабуем захоўваць аптымальны баланс у падрыхтоўцы кадраў. Спрабуем зацікавіць моладзь у атрыманні рабочай спецыяльнасці. Разам з тым па асобных спецыяльнасцях выпуск спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй нават не задавальняе патрэбы рынку ў кадрах. Менавіта таму ў гэтым годзе пайшлі на павелічэнне плана набору міністэрствы аховы здароўя і ўнутраных спраў. Да таго ж ёсць шэраг спецыяльнасцяў, дзе вучыцца вельмі складана, і прыцягнуць сюды тых, хто хоча вучыцца на платнай аснове, вельмі праблематычна. Таму даводзіцца павялічваць план бюджэтнага набору. Зразумела, у нас ёсць яшчэ і ўнутраны рэзерв — гэта пераразмеркаванне бюджэтных месцаў. Але ў апошнія гады мы ім вельмі актыўна карысталіся і практычна яго вычарпалі. Нягледзячы на максімальнае скарачэнне бюджэтнай падрыхтоўкі па незапатрабаваных спецыяльнасцях, цалкам закрыць падрыхтоўку па гэтых спецыяльнасцях мы не можам, паколькі павінны пакінуць за абітурыентамі права рэалізаваць свае прафесійныя намеры, права прайсці конкурсны адбор і атрымаць тую спецыяльнасць, пра якую яны мараць. Разам з тым мы пастаянна праводзім тлумачальную работу з абітурыентамі і іх бацькамі і папярэджваем іх аб праблемах з працаўладкаваннем па пэўных спецыяльнасцях. Але вырашаць пытанні рэгулявання прыёму ў ВНУ сілавымі метадамі, я ўпэўнены, нельга. Калі ў чалавека ёсць сродкі і жаданне атрымаць вышэйшую адукацыю, то ён яе атрымае. Магчыма, ёсць сэнс перагледзець умовы выдачы крэдытаў на навучанне: для тых, хто паступае на вострадэфіцытныя для рынку працы спецыяльнасці, трэба выдаваць крэдыты на больш выгадных умовах...

СТАР. 2



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Ліст у нумар

## КАБ НЕ БЫЛО ПАЖАРУ, ТРЭБА...

**ЯК ІНФАРМУЕ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, 87 адсоткаў пажараў адбываецца ў жыллёвым сектары, з іх 99 — узнікае па халатнасці саміх дамачадцаў. То кураць яны ў ложках у п'яным стане, то дзяцей пакідаюць без нагляду, то не чысцяць коміны, не рамантуюць печы і многае, многае іншае.**

Не, сітуацыя, як кажуць, у нас пад кантролем: супрацоўнікі МНС рэгулярна праводзяць праверкі ў прыватных дамах, кажуць уласнікам што і да чаго, уручаюць ім інструкцыі-прапановы. І ці не ў кожнай з іх — зрабіць тое, тое і тое...

Гэта пахвальна. Аднак у змяншэнні колькасці пажараў у прыватных дамах адных гэтых «указівак» яўна мала. І вось чаму. Адзінокім пажылым людзям «прадпісваць» пачысціць комін можна з тым жа поспехам, што і заняцца балетам. У свае 70—90 гадоў, перажыўшы вайну, многія ледзьве ходзяць па роўных сцежках: не тыя ўжо рукі, не тыя ногі. Дзе ўжо тут лезці на гарышча, на дах?! У выніку ў невырашальную праблему ператвараецца нават нейкая жыццёвая драбяза, не кажучы пра замену дымахода, «прыбіванне ліста 07 на 0,5 метра доўгім краем да печы»...

Не зрабіць гэта адзінокай бабулі ды і дзядулю. Да таго ж і патрэбных жалезных лістоў нешта нідзе не прадаюць (ці я не бачыў?). Вось і напрошваецца пытанне: ці не перайсці работнікам МНС ад кантролю да канкрэтных спраў? Ці не час завесці ў кожным раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях адпаведную службу з трох—пяці, а мо і болей чалавек, якія ўхілялі б выяўленыя недахопы за кошт уладальнікаў дамоў. З пенсій, з заробку. Рабілі б і рамантавалі печы і коміны, чысцілі іх ад сажы, знаходзілі тыя неабходныя жалезныя лісты, прывозілі іх, прыбівалі...

Служба такая — гэта новыя працоўныя месцы, само сабой — матэрыялы, неабходны інструмент, кваліфікаваныя кадры, якія будуць прытрымлівацца правілаў тэхнікі бяспекі.

І, галоўнае, вопыт ёсць — у тых жа газавікоў, якія і правяраюць, і рамантуюць.

Час дыктуе мець такую службу і пажарнікам. Тады і матэрыяльныя, і, галоўнае, чалавечыя страты ад пажараў будуць меншыя.

**Віктар ЛОЎГАЧ.** *г.п. Акцябрскі.*

## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ**

**по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Завод средств комплексной автоматизации»**

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-1004509 (назначение – складское помещение), общей площадью 3394,6 кв. м, 1986 года постройки, стоимостью – 3 914 162 070 (три миллиарда девятьсот четырнадцать миллионов сто шестьдесят две тысячи семьдесят) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лещинского, 8, пом. 3Н. Стоимость указана с учетом НДС.

**Торги состоятся 10.06.2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Тарашкевич А.С., тел./факс: 294 93 56, 80291773252**

**ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стоимости имущества в размере 195 708 104 белорусских рубля.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЧЕРМЕТРЕМОНТ»!

**30 июня 2010 года в 15.00** *состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Черметремонт», место проведения собрания – по месту нахождения Общества: 223017, Минский р-н, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал.*

**Повестка дня:**
1. Об уменьшении размера уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в Устав Общества.

*Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 18.06.2010. Место и время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 13.00 до 14.50 по месту его проведения.*

*Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность и доверенность (для представителей).*

*Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 21.06.2010 в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания – с 13.00 до 14.50 по месту его проведения.*

**Дирекция** **Наблюдательный совет**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ

В извещении, опубликованном в газете «Звязда» 04.05.2010, о проведении 04.06.2010 открытого аукциона по продаже единым лотом принадлежащих ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район (продавец) зданий, сооружений и иного имущества, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, район поселка Гатово, вместо слов:

«Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в следующем порядке: 10 (десять) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, с учетом внесенного задатка, перечисляются победителем торгов продавцу в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона; оставшаяся часть – в течение 180 календарных дней с даты проведения аукциона равными долями ежемесячно».

**СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ:**

**«Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в следующем порядке: 10 (десять) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, с учетом внесенного задатка, перечисляются победителем торгов продавцу в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона; оставшаяся часть – в течение 360 календарных дней с даты проведения аукциона равными долями ежемесячно».**

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»; (+375 29) 636 86 81 – ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ТУРЦЫІ АЎТОБУС З РАСІЯНАМІ ЗВАЛІЎСЯ Ў РАКУ: 15 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛА, 24 ПАРАНЕНЫЯ



**Буйное дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам аўтобуса з расійскімі турыстамі адбылося ў аўторак у Турцыі.**

Аўтобус зваліўся ў раку з абрыву ў раёне курорта Анталія. Паводле ўдакладненых звестак, у выніку аварыі загінула 15 чалавек, лік пацярпелых удакладняецца. Раней паведамлялася пра 17 загінулых і 24 параненых. Прэс-сакратар Расійскага саюза турындустрыі паведаміла, што загінулі 13 расіян і двое грамадзян Турцыі — гід і кіроўца. Чацвёра са змешчаных у бальніцы расіян знаходзяцца ў цяжкім стане. Усяго ў аўтобусе знаходзіўся 41 чалавек: 39 расійскіх турыстаў, гід і турэцкі кіроўца.

### ВАРШАВА НАЗВАЛА ІМЯ ПАБОЧНАЙ АСОБЫ, ЯКАЯ ЗНАХОДЗІЛАСЯ Ў КАБІНЕ ПОЛЬСКАГА ТУ-154

**Польшча афіцыйна пацвердзіла, што ў момант катастрофы прэзідэнцкага самалёта пад Смаленскам у кабіне пілотаў знаходзіўся галоўнакамандуючы ВПС краіны Анджэй Бласік. Пра гэта заявіў па тэлебачанні кіраўнік дзяржкамісіі па расследаванні авіяздарэнняў Эдмунд Кліх.**



Паводле яго слоў, генерал зайшоў у кабіну за некалькі хвілін да крушэння і знаходзіўся там да трагічнага канца. Бласік «жадаў азнаёміцца з сітуацыяй і адзначыў, што яна незвычайная». З'яўленне галаўкама ВПС у кабіне пілотаў — гэта нетыповая сітуацыя. Аднак Кліх адмовіўся даваць каментары на тэму, ці рабілі штосьці пілоты пад ціскам, пакінуўшы ацэнку сітуацыі псіхолагам. «Мы валодаем матэрыяламі, якія дазваляюць нам вызначыць стан лётчыкаў на пачатку і ў канцы палёту», — сказаў ён.

### АБАМА ДАМОВІЎСЯ ПРА ЛЕГАЛІЗАВАННЕ ГЕЯЎ У АРМІІ ЗША

Барак Абама дамовіўся з прадстаўнікамі Пентагона і Кангрэса пра адмену сакрэтнага правіла ў амерыканскім войску, паводле якога геям і лесбіянкам дазваляецца служыць пры ўмове, што яны не раскрываюць сваю сэксуальную арыентацыю. Рэформа, якая будзе ўхвалена ўжо хуткім часам, уступіць у дзеянне да канца года.

### DVD І BLU-RAY СЫХОДЗЯЦЬ У МІНУЛАЕ



**Група навукоўцаў з Японіі заявіла пра вынаходніцтва, здольнае пахаваць не толькі фармат аптычнага носьбіта DVD, які паступова састарваецца, але і фармат Blu-ray, які выйшаў на рынак менш пяці гадоў таму.**

Непасрэдна паставіць крыж на Blu-ray і DVD можа распрацаваны японцамі інавацыйны матэрыял для вытворчасці дыскаў. Ён створаны з выкарыстаннем нанатэхналогій і ўражвае сваімі характарыстыкамі. На адзін носьбіт, зроблены з такога матэрыялу, можна будзе запісаць столькі ж інфармацыі, колькі ўтрымліваюць сотні Blu-ray-дыскаў. На сёння максімальная ёмістасць запіснога дыска Blu-ray складае 320 Гб, але больш ужывальнымі на рынку з'яўляецца ёмістасць 7,8 ці 15,6 Гб.

## СВЯТАТАТНІКАЎ ЗАТРЫМАЛІ

**Пяць месяцаў супрацоўнікі крымінальнага вышуку Рагачоўскага РАУС шукалі злачынцаў, якія падпалілі невялікі гістарычны храм Міколы Цудатворца ля вёскі Стары Крыўск якраз пад свята Раства Хрыстовага. Як расказаў першы намеснік Рагачоўскага раённага аддзела ўнутраных спраў, начальнік крымінальнай міліцыі Арцём ЯСТРЭМСКІ, сёння можна з упэўненасцю казаць, што падпал зрабілі чатыры непрацуючыя жыхары Магілёва, два з якіх былі неаднаразова судзімыя раней:**

— Яны выкралі каля 15 абразоў, з якіх каштоўнасць уяўляў толькі адзін. Астатнія, калі разабраліся, што маюць справы з рэпрадукцыямі, злачынцы спалілі ў Магілёве. Пошук абраза святога Міколы працягваецца. На папярэднім следстве грамадзяне прызналіся, што 5 студзеня трапілі ў царкву, каб выкрасці іконы і начынне, а раніцай вярнуліся падпаліць будынак 1815 года — каб знішчыць сляды злачынства.

Усе ўдзельнікі святатацтва арыштаваныя. Зараз праводзяцца следчыя мерапрыемствы, устанаўліваецца роля кожнага з затрыманых. Нагадаем, што менавіта ў царкве вёскі Стары Крыўск знаходзілася шмат рэчаў, зробленых рукамі святой Манефы Гомельскай. Ручнікі для абразоў, як і іншае гістарычнае начынне царквы, дасталіся полымю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 мая 2010 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.05.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 000,00 | 1 чэшская крона | 143,02 |
| ▼ 1 еўра | 3 673,50 | 1 польскі злоты | 883,41 |
| 1 латвійскі лат | 5 199,76 | ▼ 1 расійскі рубель | 95,45 |
| 1 літоўскі літ | 1 062,96 | 1 украінская грыўня | 378,55 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,4293 |
| 10 UAH | 39,6634 |
| 1000 BYR | 10,4904 |
| EUR | 38,6046 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ МІНШЧЫНЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нягледзячы на значныя аб'ёмы вытворчасці прадуктаў харчавання, Мінскай вобласці не ўдалося дабіцца патрэбнага павелічэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і павышэння прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў аб недапушчальнасці прыпісак і фактаў грубага скажэння звестак статыстычнай справаздачнасці, у частцы якіх Мінская вобласць рэгулярна аказваецца ў сумніўных лідарах. «На жаль, практыка прыпісак і ашуканства культывуецца на Міншчыне не адзін год. Колькі ні папярэджваў губернатараў аб неабходнасці спыняць гэту шкодную з'яву, яна зноў і зноў адраджаецца ў тым або іншым выглядзе. Толькі не разумею, навошта гэта патрэбна? На гэтыя ж паказчыкі я менш за ўсё звяртаю ўвагі. Галоўнае — паказчык эфектыўнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аргументуючы назначэнне Барыса Батуры губернатарам, Аляксандр Лукашэнка адзначыў такія яго моцныя бакі, як уменне канцэнтраваць намаганні на галоўных напрамках і дасягаць пастаўленых мэтаў. На думку Прэзідэнта, гэта менавіта тое, што цяпер асабліва неабходна ў складаных сучасных умовах гаспадарання і развіцця рэгіёна. Аляксандр Лукашэнка адзначыў заслугі Барыса Батуры ў развіцці Магілёўскай вобласці: «Вобласць ён узняў. Тое ж патрабуецца і ў Мінскай вобласці. Па сутнасці, ёсць паўночная і паўднёвая часткі вобласці, якія моцна адрозніваюцца. Калі паўднёвая выглядае лепш, то паўночная выклікае заклапочанасць, — сказаў Прэзідэнт. — Што ж датычыцца Валерыя Іванова, то ён добра ведае пытанні развіцця аграпрамысловага комплексу і ўжо эфектыўна працаваў пад кіраўніцтвам Барыса Батуры».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць паляпшэння кадравай палітыкі ў сталічнай вобласці.

«Даручэнні навесці ў вобласці парадак з кадрамі, якія я даваў, назначаючы папярэдняга губернатара, так і не выкананы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы не змаглі пакончыць з чахардой пры падборы і расстаноўцы кіраўнікоў і спецыялістаў сельгасарганізацый. Ад іх высокай змяняльнасці і працяглых вакансій церпіць справа».

Дзевятнаццаць сельгасарганізацый вобласці і сёння застаюцца без кіраўнікоў, некаторыя — ужо больш за паўгода. Сем месяцаў заставаліся вакантнымі пасады намеснікаў старшынь Старадарожскага і Крупскага выканкамаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў дэфіцыт галоўных спецыялістаў у АПК. Штогадовая змяняльнасць гэтай катэгорыі работнікаў у Мінскай вобласці складае каля 17 працэнтаў.

Прэзідэнт асабліва закрануў праблему працаўладкавання маладых спецыялістаў. «Гэта павінна быць пад строгім кантролем губернатара. Калі малады спецыяліст паехаў на іншае рабочае месца, вам павінны неадкладна далажыць і вы павінны ўнікнуць і разабрацца з тым, хто яго прыняў на работу», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Барыса Батуры і Валерыя Іванова.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што кіраўніцтва Мінскай вобласці павінна дзейнічаць бескампрамісна ў барацьбе з абыякавасцю і хамствам чыноўнікаў. «Нельга размаўляць з простым чалавека «праз губу», чыніць яму бюракратычныя перашкоды» — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ў сваёй штодзённай інфармацыйнай рабоце кіраўніцтва вобласці павінна больш актыўна задзейнічаць рэгіянальныя СМІ.

Для Мінскай вобласці актуальныя пытанні забеспячэння грамадзян недарагім і якасным жыллём, праблемы ў сферах аховы здароўя і занятасці насельніцтва. Мінская вобласць — своеасаблівы лідар у краіне па незадаволенасці грамадзян станам паслуг жыллёва-камунальнай сферы. «Амаль палова жыхароў рэгіёна лічаць, што мясцовыя чыноўнікі ўдзяляюць гэтаму пытанню недастаткова ўвагі», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў недапушчальнасць карупцыі ў размеркаванні зямлі ў сталічнай вобласці. «Найбольш карумпаванай сферай дзейнасці для сельскіх выканкамаў стала размеркаванне зямлі», — канстатаваў ён. Гэта сведчыць аб тым, што новаму кіраўніку вобласці трэба прыняць самыя аператыўныя меры па паляпшэнні сітуацыі ў кіраўніцкім асяроддзі.

Прэзідэнт раскрытыкаваў Мінскую вобласць за такія негатыўныя з'явы, як кругавая парука, сямейнасць і кумаўство. Паводле яго слоў, менавіта з такіх агідных з'яў пачынаецца карупцыя. «Калі вы хочаце, каб вашы дзеці, родныя і блізкія дзесьці вас падтрымалі і прынеслі дзяржаве нейкую карысць, калі ласка — у дзяржаўную структуру, на пасаду. Няхай пакажуць сябе. Але калі тата начальнік, а дзеці займаюцца камерцыяй — гэта заразлівы прыклад для іншых чыноўнікаў. Гэта абсалютна недапушчальна!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаў незадаволенасць станам законнасці і правапарадку ў Мінскай вобласці. «Мясцовыя ўлады павінны гарантаваць бяспеку людзей, каб кожны грамадзянін быў надзейна абаронены дзяржавай ад любых злачынных замахаў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — З тымі, хто крыўдзіць людзей, трэба бязлітасна змагацца».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўзровень злачыннасці ў рэгіёне хоць і зменшыўся ў абсалютным выражэнні, але, як і ў папярэднія гады, застаецца самым высокім сярод абласцей. А ў 6 раёнах гэты паказчык і наогул перасягае сярэднеабласныя даныя (у Смалявіцкім, Пухавіцкім, Бярэзінскім, Мінскім, Лагойскім і Чэрвеньскім). Дрэнна працуюць праваахоўныя органы Барысаўскага і Маладзечанскага раёнаў.

Найбольш крымінагенная сітуацыя склалася ў Жодзіне, дзе колькасць цяжкіх злачынстваў узрасла больш як на 15 працэнтаў, а крадзяжоў — больш як на 34 працэнты. Больш таго, у горадзе адбыўся рэзкі ўсплёск злачыннасці непаўналетніх, рэцыдыўнай злачыннасці, злачынстваў у стане алкагольнага ап'янення. «Асабліва хвалюе сітуацыя з рэцыдывістамі, рост злачынстваў сярод якіх амаль 100 працэнтаў. Гэта самы горшы паказчык у краіне», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў Барысу Батуру губернатарскае пасведчанне, павіншаваўшы яго з выбраннем на пасаду. Кіраўнік дзяржавы таксама падзякаваў дэпутатам Мінскага абласнога Савета за падтрымку гэтай кандыдатуры.

У сваім слове ў адказ старшыня Мінаблвыканкама запэўніў Прэзідэнта, што новае кіраўніцтва вобласці будзе прыкладаць усе намаганні для таго, каб навярстаць упушчанае і выканаць прагнозныя паказчыкі на бягучыя год і пяцігодку. «Мы ўсведамляем усю складанасць і важнасць тых задач, якія стаяць перад намі, — сказаў Барыс Батура. — Усё, што магчыма зрабіць у гэтым годзе, каб выканаць праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці, мы зробім». Ён дадаў, што ў Мінскай вобласці сканцэнтраваны сур'ёзныя і вопытныя кадры, якія могуць паспяхова вырашыць шырокае кола задач, якія стаяць перад рэгіёнам.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# КОНКУРСНАЯ СІТУАЦЫЯ ЗМЯНЯЕЦЦА НА КАРЫСЦЬ АБІТУРЫЕНТАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Юрый Міксюк прызнаўся, што канкурэнцыя за абітурыентаў паміж беларускімі ВНУ абвастраецца. Да таго ж цяпер ім даводзіцца канкурыраваць яшчэ і з ВНУ, размешчанымі ў суседніх дзяржавах. Зараз за мяжой вышэйшую адукацыю атрымліваюць каля 10 тысяч маладых беларусаў, з іх пераважная большасць — у Расіі.

— У бліжэйшай будучыні ВНУ будуць рабіць большы ўпор на тых, хто хоча атрымаць другую і наступную вышэйшую адукацыю, — падкрэсліў спецыяліст. — Лозунг «Адукацыя — не на ўсё жыццё, а праз усё жыццё» актуальны сёння для ўсіх краін свету. Таму зацвярджаючы лічбы набору ў ВНУ, мы не можам не ўлічваць гэтую агульнасусветную тэндэнцыю.

У 2010 годзе шэраг беларускіх ВНУ распачне падрыхтоўку па новых для іх спецыяльнасцях. Так, у БНТУ пачнуць рыхтаваць геадэзістаў, у БДУІР адкрыецца спецыяльнасць «электронныя сродкі бяспекі», у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы — спецыяльнасці «інфарматыка», «вытворчасць прадукцыі і арганізацыя грамадскага харчавання», «камп'ютарная бяспека», у Полацкім дзяржаўным універсітэце — «аўтамабільныя дарогі», «электразабеспячэнне» і новая спецыялізацыя «геаінфармацыйныя сістэмы». Да таго ж сёлета былі ўнесены дзве новыя спецыяльнасці ў Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь: «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» і «Прыкладная інфарматыка». Падрыхтоўка кадраў па гэтых спецыяльнасцях распачнецца ў БДУ.

З'явіліся сёлета ў Беларусі і дзве новыя ВНУ: факультэт пагранічнай службы Ваеннай акадэміі быў рэарганізаваны ў самастойную ВНУ, а Магілёўскі каледж МУС стаў вышэйшым каледжам. «Набор у новы Інстытут пагранічнай службы будзе ажыццяўляцца ў Ваеннай акадэміі на факультэце пагранічнай службы, паколькі рашэнне аб стварэнні інстытута было прынята зусім нядаўна», — патлумачыў Юрый Міксюк.

Прадстаўнік галоўнага адукацыйнага ведамства запэўніў журналістаў у тым, што глеба для дачы хабару падчас прыёмнай кампаніі была ліквідаваная дзякуючы ўкараненню цэнтралізаванага тэсціравання. «Для таго, каб даць правільныя адказы на заданні тэстаў, патрэбны веды, і ніякія грошы тут не дапамогуць», — дадаў спецыяліст. Юрый Міксюк паведаміў, што ў гэтым годзе ўпершыню для абітурыентаў, якія паступаюць у ССНУ на аснове базавай адукацыі, пісьмовыя іспыты будуць праводзіцца па цэнтралізаваных заданнях, падрыхтаваных спецыялістамі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Гэта не цэнтралізаванае тэсціраванне, а да ведаў абітурыентаў усіх сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў будуць прад'яўляцца аднолькавыя патрабаванні...

## ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

***У структуры прыёму на дзённую форму навучання спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю займаюць каля 25 працэнтаў. На спецыяльнасці аховы здароўя і педагагічнага профілю прыпадае па 11 працэнтаў, на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці — 8 працэнтаў, прыродазнаўчыя — 6,8 працэнта, архітэктуру і будаўніцтва — 6 працэнтаў, спецыяльнасці эканамічнага профілю — 6,6 працэнта і юрыдычнага — толькі 4,1 працэнта (гэта з улікам павелічэння на 400 месцаў прыёму ў ВНУ МУС).***

Ва Урадзе

# БЕЛАРУСЬ УЖО РЫХТУЕЦЦА ДА ЗІМЫ...

**ПАДРЫХТОЎЧЫЯ работы да асенне-зімовага перыяду сёлета ў краіне мяркуецца завяршыць да 1 кастрычніка, а афармленне актаў праверкі гатоўнасці і пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплаэнергіі і цеплавых крыніц павінна быць забяспечана ўжо да сярэдзіны згаданага месяца. Акрамя таго, на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі, вялася гаворка і пра тое, што сёлета неабходна павялічыць долю мясцовых відаў паліва ў паліўна-энергетычным балансе. «Заданне на год устаноўлена ў памеры 19,8 працэнта», — паведаміў Уладзімір Сямашка.**

Разам з тым, апошняму пытанню, на думку першага намесніка прэм'ера, міністэрствы і ўстановы надаюць неналежную ўвагу і робяць недастаткова захадаў для ўцягвання мясцовых відаў паліва ў паліўна-энергетычны баланс. «Мы знаходзімся пакуль далёка ад гадавога задання», — канстатаваў ён.

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, дакладваючы аб падрыхтоўцы краіны да зімы, заўважыў, што рэалізацыя захадаў па своечасовым правядзенні работ, якія забяспечваюць устойлівае функцыянаванне аб'ектаў, інжынерных камунікацый і ўсёй народнай гаспадаркі ў асенне-зімовы перыяд, дазволіць на належным узроўні забяспечыць галіны эканомікі і насельніцтва палівам і не дапусціць збояў у рабоце паліўна- і энергазабяспечваючых арганізацый. Ён падкрэсліў, што сёлета ўпершыню выдзелены заданні па аб'ёмах работ, якія павінны быць выкананыя да 1 кастрычніка, гэта значыць, да пачатку ацяпляльнага сезона, і да канца года. «Такое нowаўвядзенне прадыктаванае неабходнасцю больш рацыянальнага размеркавання як фінансавання, так і загрузкі рамонтных брыгад, улічваючы, што пэўны аб'ём работ па замене і будаўніцтве цеплавых сетак будзе выконвацца і пасля пачатку ацяпляльнага сезона», — патлумачыў ён.

Паводле слоў міністра, у цэлым для падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона прадпрыемствам электраэнергетыкі павінны замяніць ці пабудаваць 118 кіламетраў сетак, у тым ліку да 1 кастрычніка не менш за 74 кіламетры. Арганізацыям жыллёва-камунальнай гаспадаркі даводзіцца заданне замяніць да канца года больш за 711 кіламетраў сетак, з іх да 1 кастрычніка павінна быць заменена 624 кіламетры. Запасы паліўнага мазуту на пачатак кастрычніка вызначаныя ў памеры 480 тысяч тон, прычым стварыць іх не з'яўляецца вялікай праблемай. Згодна са статыстычнымі звесткамі, на 1 мая ў цэлым па краіне запасы мазуту складалі 492 тысячы тон — гэта 102,5 працэнта ад запланаваных на пачатак кастрычніка запасаў. Акрамя таго, прадпрыемствам і арганізацыям даведзены заданні па закупцы паліўных брыкетаў: іх аб'ёмы вызначаныя на ўзроўні 565 тысяч тон умоўнага паліва. Для стабільнай работы народнай гаспадаркі ў асенне-зімовы перыяд прадугледжваецца таксама стварыць актыўныя запасы прыроднага газу да 20 лістапада ў максімальна магчымых аб'ёмах для адбору ў Асіповіцкім, Прыбугскім і Мазырскім падземных сховішчах газу. Фінансаванне закупак блакітнага паліва будзе ажыццяўляцца як за кошт уласных сродкаў ААТ «Белтрансгаз», так і за кошт прыцягнення крэдытных рэсурсаў. Запампоўванне газу, паведаміў міністр, павінна весціся ў адпаведнасці з графікам і з улікам цэнаснага фактару.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# Мінгарвыканкам зацвердзіў тарыфы на паркоўку транспартных сродкаў

**Мінгарвыканкам зацвердзіў тарыфы на паркоўку транспартных сродкаў у спецыяльна абсталяваных месцах. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар ДУ «Паркоўкі сталіцы» Леанід ДАРАШЧОНАК.**

Суразмоўца нагадаў, што з 1 студзеня 2010 года ў сталіцы адменены мясцовы збор з карыстальнікаў за паркоўку транспартных сродкаў у спецыяльна адведзеных месцах. Такое рашэнне было прынята для зніжэння падатковай нагрузкі на фізічных і юрыдычных асобаў. Выключэнне склалі ведамасныя стаянкі, на якіх спаганяецца не збор, а плата за захоўванне машыны. Напрыклад, у ГЦ «Ждановічы» або іншых буйных гандлёвых аб'ектах. Але ў сакавіку выйшаў указ № 143, які замест мясцовага збору ўвёў плату за стаянку на паркоўцы. Яе памер вызначаецца рашэннем Мінгарвыканкама.

Рашэннем гарвыканкама зацверджаны тарыфы на паркоўку ў спецыяльна абсталяваных месцах:

— паркоўка транспартнага сродку да 20 хвілін — Br1 тыс., ад 21 хвіліны да 1 гадзіны за кожную наступную гадзіну паркоўкі — Br2 тыс.;

— кругласутачная паркоўка транспартнага сродку за адну гадзіну часу з 19.00 да 9.00 — Br300;

— абанемент на месяц для паркоўкі транспартнага сродку пры рэалізацыі фізічным асобам — Br80 тыс., юрыдычным асобам — Br100 тыс.;



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— пры разліку карткамі паркоўкі з фіксаваным часам 20 хвілін — Br1 тыс., 60 хвілін — Br2 тыс.

Зацверджаны таксама тарыфы пры разліку электроннымі дэбетовымі карткамі.

Паркоўка легкавых аўтамабіляў з прычэпам, мікрааўтобусаў, аўтобусаў, грузавых аўтамабіляў аплачваецца па тарыфу ў двайным памеры.

Леанід Дарашчонак падкрэсліў, што памер платы ў параўнанні з раней дзейным не павялічыўся. У найбліжэйшыя дні пералік платных аўтапарковак будзе зацверджаны на пасяджэнні Мінгарвыканкама. Рашэнне гарадскіх уладаў уступіць у сілу пасля апублікавання ў прэсе.

# ДОЎГІ ШЛЯХ ДАДОМУ

**Днямі ў музеі Батанічнага саду Берліна адбылася перадача паслу Беларусі ў ФРГ Андрэю Гіро кніг па біялогіі і батаніцы, якія былі вывезены з Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны.**

Падчас афіцыйнай цырымоніі перадачы наш пасол ад імя беларускага боку выказаў словы ўдзячнасці кіраўніцтву Батанічнага саду за бязвыплатную перадачу літаратуры. Ён, у прыватнасці, падкрэсліў важнае сімвалічнае значэнне гэтай акцыі, якая паслужыць справе прымірэння паміж народамі Беларусі і Германіі.

Дамоў вярнулася навуковая літаратура, выдадзеная ў перыяд з 1824 па 1940 год на лацінскай, нямецкай, французскай, рускай, беларускай і ўкраінскай мовах. Калі верыць бібліятэчным штампам, гэтыя кнігі належалі ў асноўным Сельскагаспадарчай акадэміі ў горадзе Горкі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ТРАНСПАРТНА-ЛАГІСТЫЧНЫ ЦЭНТР ПАЧАЛІ БУДАВАЦЬ ПАД РАКАВАМ БЕЛАРУСЫ І ЛІТОЎЦЫ

**БУДАЎНІЦТВА транспартна-лагістычнага цэнтра пад Ракавам за 27 кіламетраў ад Мінска распачалося на мінулым тыдні. Гэты праект узяліся рэалізаваць тры інвестары — літоўская лагістычная кампанія «Vinges Logistic», літоўская будаўнічая кампанія «Alvora» і беларуская кампанія «Белінтэртранс», якая займаецца міжнароднымі грузавымі перавозкамі. Агульны аб'ём інвестыцый у будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра — 18 мільёнаў еўра, акупляльнасць праекта — 7-8 гадоў.**

— Будаўніцтва будзе весціся ў два этапы — на першым, які закончыцца ў сакавіку 2011 года, будзе ўзведзены будынак плошчай 20 тысяч квадратных метраў, а на другім, які плануем завяршыць ў снежні 2011 года, — будынак на 10 тысяч квадратных метраў, гэта будуць складскія і офісныя памяшканні. Будзе створана 150 працоўных месцаў у асноўным для людзей з Валожынскага раёна, — падзяліўся планамі **Мікалай КАЛЕСНІК, генеральны дырэктар кампаніі «Alvora».** — Што датычыцца геаграфічнага месцазнаходжання, то мне падаецца, што выбар удалы — тут якраз добрая аўтамабільная развязка, а наш цэнтр разлічаны на прыцягненне грузаў і абслугоўванне грузапатокаў на міжнародных аўтамагістралях Клайпеда—Вільнюс—Мінск і далей на Расію.

Мікалай Калеснік таксама адзначыў, што гэта першы транспартна-лагістычны цэнтр такога маштабу ў Беларусі:

— У Літве рынак практычна насыціўся такімі лагістычнымі цэнтрамі, а тут іх не хапае. Таму мы бачым добрую перспектыву, лічым, што рызыка цалкам апраўданая, і інвестуем свае сродкі.

Адзінае, што турбуе літоўскіх інвестараў, — гэта няпэўнасць з Мытным саюзам Беларусі, Расіі і Казахстана:

— Не зусім зразумела, што будзе з Мытным саюзам і якія там будуць умовы. Мы планавалі тут адкрыць мытны тэрмінал, але паглядзім, якія будуць умовы ў Мытным саюзе і тады прымем рашэнне, — сказаў Мікалай Калеснік.

Пакуль што бізнэсмены думаюць у асноўным пра будаўніцтва, але пакрысе наладжваюць стасункі з патэнцыйнымі кліентамі:

— Цяпер мы вельмі шчыльна займаемся менавіта наборам заказаў. Ёсць патэнцыйныя заказчыкі з Беларусі, а ёсць і замежныя кампаніі. Увогуле за суткі мы плануем прымаць каля 200 аўтамабіляў, — расказаў **Вячаслаў СІКОРСКІ, дырэктар нядаўна створанага якраз для будаўніцтва СТАА «БелВінгесЛагістык»,** і выказаў аптымізм наконт завяршэння будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра, — «Альвора» мае 10-гадовы вопыт будаўніцтва, «Вінгес-Лагістык» з'яўляюцца прафесіяналамі ў сістэме лагістыкі, а «Белінтэртранс» — гэта міжнародныя перавозкі. Такім чынам тры галіны аб'ядналіся для рэалізацыі праекта, які, я мяркую, будзе паспяховы.

На ганаровым пераразанні чырвонай стужкі сабраліся не толькі інвестары, але і ўсе тыя, хто зацікаўлены ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў такога кшталту — паслы Беларусі ў Літве і Літвы ў Беларусі, прадстаўнікі Мінтранса, Мінаблвыканкама, а таксама мясцовай улады. Пасля таго, як чырвоную стужку перарэзалі і асвяцілі месца будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра, **Вячаслаў ДОЎНАР, генеральны дырэктар «Белінтэртранс»,** член Савета па развіцці прадпрымальніцтва, расказаў журналістам, што не вельмі проста даваўся прадпрымальнікам гэты інвестыцыйны праект:

— Эканамічны крызіс унёс свае карэктывы. Ён закрануў маіх партнёраў у Літве, закрануў і маё прадпрыемства. Скажу шчыра — увесь мінулы год мы займаліся тым, каб захаваць свой бізнэс, перажыць крызіс, захаваць калектывы, — сказаў Вячаслаў Доўнар. — Напэўна, нават і да лепшага, што мы адклалі будаўніцтва, бо з-за крызісу гэты транспартна-лагістычны цэнтр не змог бы функцыянаваць як мае быць — стаяў бы проста прыгожы склад без эфектыўнай працы. Я вельмі ўдзячны мясцовым уладам за тое, што нас ніхто не караў і не даваў штрафных санкцый, а наадварот, нам аказвалася падтрымка. І сёння мы з новымі сіламі ўзяліся за будаўніцтва і, спадзяюся, цэнтр хутка пачне працаваць.

Дарэчы, Вячаслаў Доўнар адзначыў, што на сёння пайшло ажыўленне ў сферы грузаперавозак — як у краінах Заходняй Еўропы, так і СНД.

На пачатку будаўніцтва прысутнічалі прадстаўнікі Беларускай універсальнай таварнай біржы, якія таксама прыглядаюцца да будучага аб'екта:

— Лагістычныя цэнтры нам цікавыя тым, што мы бачым тут удасканаленне біржавага гандлю. Калі сёння мы проста выступаем з пазіцыі прадаўца ці пакупніка, то ў перспектыве зможам прапанаваць пакупніку тавар у лагістычных цэнтрах, неабавязкова толькі ў Беларусі — у Маскве, ва Украіне, у Прыбалтыцы. І кліент зможа літаральна прыйсці, памацаць тавар і набыць яго без мытных і дарожных збораў, — сказаў **Павел ІГНАТОВІЧ, начальнік аддзела лагістыкі Беларускай універсальнай таварнай біржы.**

Усяго, па словах **намесніка міністра транспарту і камунікацый Аляксандра НЕСЦЯРОВІЧА,** у Беларусі запланавана будаўніцтва 50 транспартна-лагістычных цэнтраў, з іх 18 будуць на Міншчыне.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. ОРШЕ

| № п/п | Месторасположение и площадь земельного участка | Начальная стоимость (руб.) | Условия заключения договора аренды | Инженерное обеспечение участка | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок по улице Пограничной, У-2 в г. Орше площадью 0,0288 га. Кадастровый номер 242400000001011270 | 842 780 | Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под торговый павильон. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. Пограничная, где находится земельный участок, имеются сети газоснабжения, водоснабжения, электрической и телефонной связи. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное водоотведение – отсутствует, централизованное теплоснабжение – имеется, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – отсутствует. | 84 270 |

Примечание:

1. Аукцион состоится в **11.00 29 июня 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагаются заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены объекта, а также:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина или индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица* – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

*представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представителем иностранного гражданина* – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день его проведения;
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;
- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

4. Задаток вносится на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в АСБ «Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911.

5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18, сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 23 июня 2010 года включительно.

Контактные телефоны в г. Орше: (8 0216) 21 13 14, 21 12 42. Предварительное ознакомление с объектом торгов – контактный телефон в г. Орше: 24 40 32.

# РЭГІЁНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ ЗА АДЗНАКУ Ў МІЛЬЁН

**Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, сярэдняя па Беларусі намінальная налічаная зарплата ў красавіку склала 1 млн 116,8 тыс. рублёў — на 21,6 тыс. рублёў, ці на 2 працэнты больш, чым у папярэднім месяцы. Пры гэтым у параўнанні з сакавіком на 1,3 працэнта ўзраслі і рэальныя, з улікам змянення цэн на тавары і паслугі, заробкі.**

У прыватнасці, адзначылі ў Нацыянальным статкамітэце, сярэднія заробкі ў красавіку на прамысловых прадпрыемствах выйшлі на ўзровень 1 млн 246,2 тыс. (разам з тым тут назіраецца ці не самая значная «разбежка»: ад 1 млн 912,3 тыс. па паліўнай прамысловасці, 1 млн 899,3 тыс. па чорнай металургіі, 1 млн 724,6 тыс. па хіміі і нафтахіміі да 924,8 тыс. па лясной і дрэваапрацоўчай і 788,5 тыс. — па лёгкай прамысловасці), у будаўнічых арганізацыях — на 1 млн 494,6 тыс., арганізацыях транспарту — 1 млн 341,3 тыс., сельскай гаспадаркі — 766,6 тыс., гандлю і грамадскага харчавання — 1 млн 2,7 тыс. рублёў. Адначасова сярэдні ўзровень аплаты працы па ахове здароўя склаў 836,9 тыс., адукацыі — 745,8 тыс., культуры і мастацтве — 791,8 тыс., сацыяльным забеспячэнні — 633,5 тыс., навуцы і навуковым абслугоўванні — 1 млн 548,1 тыс. рублёў.

Што да асобных рэгіёнаў, то тут па сярэднім паказчыку заробкаў за рысай у мільён рублёў у красавіку засталіся толькі Магілёўская (983,7 тыс.) і Віцебская (992,2 тыс.) вобласці. Узровень аплаты працы па Брэсцкай вобласці склаў 1 млн 4 тыс., Гродзенскай — 1 млн 7,3 тыс., Гомельскай — 1 млн 52,5 тыс., Мінскай — 1 млн 76,4 тыс., а па сталіцы — 1 млн 490,5 тыс. рублёў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

◢ Мазыраніна сабакі загналі на дрэва, дзе ён правёў цэлую ноч. 27-гадовы мужчына вяртаўся ўвечары з прыгараднай вёскі ў Мазыр. З чыгуначнай станцыі ён накіраваўся да аўтобуснага прыпынку. У гэты момант за ім пагналіся два вялікія сабакі. Хлопец узлез на бліжэйшае дрэва. Калі сцямнела, спусціцца ўжо не змог — анямелі рукі і ногі. Ноч ён правёў на дрэве. Толькі раніцай наступнага дня мінак убачыў яго і выклікаў хуткую дапамогу. Медыкі дыягнаставалі агульнае парааахаладжэнне. Пацярпелага шпіталізавалі.

**◢ У Мінску патануў школьнік, які скокнуў з дамбы ў ваду. Два хлопчыкі, 1992 і 1994 г.н., увечары пасля заняткаў адправіліся купацца на вадаём у Мінску побач з домам па вул. Брэсцкай. Малодшы з іх скакаў у ваду з агароджы пляцоўкі дамбы, затым да яго далучыўся і старэйшы хлопчык. Ён скокнуў у ваду і пачаў тануць. Таварыш спрабаваў яго выратаваць, але не змог. Жанчына, якая ішла міма, пазваніла ў міліцыю. Аднак выратаваць школьніка не ўдалося. Праверку праводзіць пракуратура.**

◢ Жыхар Сенненскага раёна за мабільнік забіў 77-гадовую жанчыну. 26-гадовы хлопец, які нядаўна вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, вырашыў абрабаваць бездапаможную пажылую жанчыну. Ён нанёс ёй больш за 40 удараў нажом, а ў якасці здабычы забраў мабільны тэлефон і падзараднае прыстасаванне. У міліцыю пра жорсткае забойства паведаміла дачка ахвяры. Злачынца затрыманы.

**◢ Францыя плануе павысіць пенсійны ўзрост з цяперашніх 60 гадоў. Наколькі ён будзе павялічаны, пакуль невядома, аднак праведзенае на мінулым тыдні сацыялагічнае апытанне паказала, што дзве трэці жыхароў краіны згодныя з яго павышэннем да 62 гадоў. Цяпер пенсійны ўзрост у Францыі з'яўляецца адным з самых нізкіх у Еўропе. Між тым чатыры з пяці вядучых прафсаюзаў краіны аб'явілі пра сваё непрыняцце рэформы. Яны плануюць пачаць агульнанацыянальны страйк супраць перагляду пенсійнага ўзросту.**

## Поўны абзац

◢ У Амерыцы разбіўся трэйлер, на волі апынуліся полчышчы пчол. У ДТЗ трапіў трэйлер, які перавозіў каля 7 тыс. пчаліных вулляў. У выніку вылецела каля 17 млн пчол, загінуў адзін чалавек. Выратавальныя службы былі вымушаныя прымяняць пажарныя брандспойты, каб разагнаць насякомых. Паведамляецца, што многія выратавальнікі атрымалі шматлікія ўкусы і былі шпіталізаваныя.

**◢ У Варонежы ў саўне мужчыну пакусалі... скарпіёны. У адной з саун горада, дзе была кампанія з 12 чалавек, мужчына ўзяў з сабой каробку з 20 скарпіёнамі, якіх ён прывёз з камандзіроўкі ў Афганістан. У выніку адзін з яго прыяцеляў, 30-гадовы бізнэсмен, выпадкова сеў на гэтую каробку, і яна адчынілася. Скарпіёны тут жа пакусалі небараку. Яго ў цяжкім стане даставілі ў таксікалогію. Скарпіёны разбегліся па лазні. Яе супрацоўнікам удалося знішчыць толькі 12 асобін з 20-ці.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ЧЫНОЎНІК ПАДАЗРАЕЦЦА Ў НЕАДНАРАЗОВЫМ АТРЫМАННІ ХАБАРУ

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, Галоўным следчым упраўленнем папярэдняга расследавання МУС Беларусі ўчора было прад'яўлена абвінавачанне начальніку ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалаю Кому ў неаднаразовым атрыманні хабару, перавышэнні службовых паўнамоцтваў. Акрамя таго, згаданай асобе прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні іншых злачынстваў. У міністэрстве ўдакладнілі, што ў адносінах да абвінавачанага выбрана мера стрымання ў выглядзе заключэння пад варту.

## НЕВЯДОМЫ СПУСТОШЫЎ СЕЙФ

**у «Доме паломнікаў» Свята-Елісавецінскага манастыра і завалодаў буйной сумай грошай.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, па дапамогу да праваахоўнікаў звярнулася манашка, якая паведаміла пра крадзеж. Невядомы падабраў ключ і пранік у «Дом паломнікаў», які знаходзіцца ў вёсцы Цнянка Мінскага раёна. Злачынца нацэліўся на сейф, які там знаходзіўся, і змог выкрасці з яго 20 мільёнаў рублёў, 1 тысячу долараў ЗША, 1920 еўра і 800 польскіх злотых. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## МАЙСТАР — ЗЛОДЗЕЙ

На тэрыторыі рамонтнай базы па вул. Войкава ў Баранавічах нехта ўкраў з палівазапраўшчыка «ПЗ-22» дзве клінкетныя засаўкі. Прадпрыемству былі нанесены страты ў памеры больш за 10 млн рублёў. Аператыўнікі пачалі шукаць украдзенае і зрабілі вобыск у майстра, які працуе на гэтым жа прадпрыемстве. Частку украдзенага знайшлі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе в том числе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Стартовая цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Понизовье, уч. № 6 623284604601000120 | 0,1854 | 2771730 | 1349201 |
| 2 | д. Понизовье, уч. № 7 623284604601000121 | 0,1854 | 2771730 | 1349201 |

**Примечание:** имеются ограничения в использовании в связи с нахождением земельных участков в водоохранной зоне реки Гайна.

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 24 июня 2010 года в 10.00 по адресу: г Логойск, ул. Тимчука, д. № 6, ком. № 7.** Заявления на участие и необходимые документы, принимаются по 22 июня 2010 года по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, ком. № 9.

**Контактные телефоны: (01774) 55473, 54350.**
**Информацию можно найти на сайте www.logoysk.by**

Утерянные бланки страховых полисов серии НС №№ 0147447, 0148801 - 0148802, 0150338, 0152286 - 0152287, 0153059 - 0153060, 0153476, 0153491 - 0153492, 0154098 - 0154099, 0154122, 0154335 - 0154337, 0154660, 0154780 - 0154787, 0155591, 0156428, 0156475, 0159031, 0159935, 0160647 - 0160648, 0160650, 0161843, 0172003, 0172419, 0173292 - 0173293, 0177907, 0180280, 0180697, 0187085, 0187125 - 0187126, 0187540, 0187542 - 0187545, 0188808, 0189948, 0191466 - 0191467, 0191819, 0191839, 0192086, 0192536, 0194213, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», в количестве 59 шт. **считать недействительными.**

26 МАЯ 2010 г. СЕРАДА № 20 (15623)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Ігар БУЗОЎСКІ:

## «АКЦЫЯ «ПЫТАННЕ ПРЭЗІДЭНТУ» ДАПАМАГАЕ ЛЕПШ ДАВЕДАЦЦА ПРА ІМКНЕННІ МОЛАДЗІ»

**Такую думку выказаў першы сакратар ЦК БРСМ на нацыянальным дзіцячым форуме «Дзеці Беларусі: ініцыятыва, творчасць, пошук».**



Як расказаў Ігар Бузоўскі, некалькі гадоў таму ў Беларусі ўжо праводзілася акцыя на лепшы ліст кіраўніку дзяржавы. Яна мела поспех у дзяцей і моладзі. Каля 20 хлопцаў і дзяўчат, якія накіравалі самыя цікавыя пытанні, атрымалі магчымасць задаць гэта пытанне асабіста. Такія акцыі дапамагаюць арганізацыі лепш даведацца пра імкненні і надзеі сваіх членаў, знайсці новыя, часам нечаканыя вырашэнні праблем, даюць магчымасць лепш зразумець матывацыю ўчынкаў таго ці іншага дзіцяці, адзначыў моладзевы лідар.

— Нам неабходныя вашы пытанні, прапановы і думкі па ўдасканаленні працы моладзевых арганізацый, па паляпшэнні жыцця ў рэгіёнах, па ўмацаванні дружбы і супрацоўніцтва паміж рознымі моладзевымі аб'яднаннямі. Мы спадзяёмся, што ў выніку мы не толькі атрымаем зрэз праблем, але і зможам дзякуючы ўзнятым вамі тэмам скаардынаваць працу моладзевых арганізацый на будучыню, — адзначыў Ігар Бузоўскі.

Паводле яго слоў, аналіз пытанняў, якія ўжо паступілі, сведчыць пра тое, што моладзь цікавіцца будучыняй сваёй краіны, яе развіццём, эканомікай і палітыкай. Пытанняў прыватнага характару — просьбаў аб набыцці бытавой тэхнікі ці рэчаў — паступіла вельмі мала. Моладзь пазітыўна паставілася да прапанаванай акцыі, пытанні вельмі сур'ёзныя, патрабуюць канструктыўных вырашэнняў.

Ігар Бузоўскі расказаў, што ідэя правядзення акцыі, як і многіх іншых ініцыятыў БРСМ і БРПА, была падхоплена з рэгіянальнага вопыту. Некалі падобную акцыю праводзіў адзін з абкамаў, моладзь задавала пытанне губернатару. «Гэта тыя ініцыятывы, якія трэба развіваць і праводзіць як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях. Ніхто не перашкаджае вам цяпер ініцыяваць падобную акцыю ў сваім раёне і вырашаць пытанні развіцця рэгіёна, горада, школы», — адзначыў моладзевы лідар.

Нацыянальны дзіцячы форум традыцыйна праводзіцца ў Мінску напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей. Яго мэта — пашырэнне ўдзелу дзяцей і моладзі ў вырашэнні пытанняў, што датычацца іх жыцця, садзейнічання рэалізацыі дзіцячых самадзейных ініцыятыў, выяўленне і падтрымка таленавітых лідараў грамадскіх аб'яднанняў.

Сёлета ў форуме ўзялі ўдзел больш за 130 навучэнцаў — прадстаўнікоў органаў вучнёўскага самакіравання, членаў дзіцячых і моладзевых грамадскіх аб'яднанняў і ініцыятыў з усіх рэгіёнаў краіны.

**Кар. БЕЛТА.**

Выпрабавана на сабе

# ПРАЦА НА АДЗІН ДЗЕНЬ...

## або Як я спрабавала змяніць сферу дзейнасці

**Ідучы па горадзе, заўважыла на дзвярах адной са сталічных кавярняў вялізную, проста велізарную, на мой погляд, паперчыну, на якой прыкладна таго ж маштабу літарамі было надрукавана — «ПАТРАБУЮЦЦА!»... А ўжо ўнізе больш дробным шрыфтам прапісваліся вакансіі, на якія вядзецца набор супрацоўнікаў. Сярод іх мне спадабаліся дзве: адміністратар і афіцыянт. Калі першая прыцягнула маю ўвагу з-за перспектывы атрымаць прыярытэт кіраўніка ў пэўнай ступені, то другая — магчымасцю зарабляць грошы кожны дзень — так званага «чаю», акрамя належнага па законе заробку. Праўда, паўставала праблема: вопыту працы ні па той, ні па другой вакансіі ў мяне не было. Але паспрабаваць пайсці на поспех я ўсё ж такі вырашыла.**



Прыемная дзяўчына-адміністратар прапанавала мне запоўніць анкету, па выніках адказаў на пытанні якой і павінна была вырашыцца мая працоўная будучыня. Вядома ж, не абышлося там без радкоў кшталту «Вопыт працы» ці «Наяўнасць працоўнай/сан. кніжкі», а таксама «На які тэрмін вы працаўладкоўваецеся: на пастаяннай аснове, часова ці на падпрацоўку?». Зразумела, што вопыт працы ў гэтай сферы ў мяне нулявы, працоўная кніжка ёсць, а вось медагляд давядзецца прайсці. Ды, наколькі я зразумела, даволі грунтоўны. А калі ўлічваць, што я студэнтка, і мне трэба яшчэ бегаць ва ўніверсітэт на заняткі, то самы аптымальны варыянт для мяне — падпрацоўка. Я ведаю, што многія мае сябры вядуць такое вось актыўнае жыццё: днём вучацца, увечары ці ноччу працуюць. Цяжка, але магчыма. Усё ж перспектыва злезці з бацькоўскай шыі і паспрабаваць стаць самастойным чалавекам: і ў матэрыяльным, і ў маральным плане. Вось і мне захацелася чагосьці такога. Ды ў прыдачу да ўсяго цікава было б паспрабаваць сябе ў нечым новым.

Пасля таго, як мая анкета была запоўненая, ветлівая дзяўчына-адміністратар уважліва яе перачытала і, чамусьці, перапытала: «На падпрацоўку?» І, атрымаўшы станоўчы адказ ужо ў вуснай форме, папрасіла мяне пачакаць. Як яна патлумачыла, ёй трэба параіцца з менеджарам, ці ёсць неабходнасць набіраць яшчэ людзей на падпрацоўку. Сутнасць у тым, што ахвотных працаваць пастаянна — дэфіцыт. Чакаць мне давялося хвілін 15, пасля чаго ўсё тая ж дзяўчына і ўсё гэтак жа ветліва сказала, што, на жаль, працаўладкаваць мяне яны не могуць: месцы ўжо занятыя. Маё спадзяванне паспрабаваць сябе ў якасці супрацоўніка рэстараннага бізнэсу было пад пагрозай. Але цікаўнасць аказалася мацнейшай за разгубленасць ці расчараванасць, і я вырашыла проста напрасіцца на працу... на адзін дзень. Мне падаецца, што журналісту карысна спрабаваць сябе ў самых разнастайных сферах грамадскага жыцця, у тым ліку і змяняць прафесію. Няхай і на адзін дзень. Галоўнае — спасцігнуць сутнасць і хоць бы паспрабаваць папрацаваць з тым жа імпэтам, як гэта робяць прафесіяналы. Безумоўна, не ўсё адразу атрымаецца, але на памылках, як кажуць, і вучацца.

Карацей, пасля доўгай гутаркі з адміністратарам, менеджарам і афіцыянтамі змены мне дазволілі папрацаваць адзін дзень для атрымання неабходнай інфармацыі для напісання матэрыялу. Зразумела, пра зарплату я не магла і марыць нават, а вось так званы «чай» (мяне запісалі ў афіцыянткі) мне дазволілі забраць. Праўда, спадзяванняў на тое, што ён будзе вялікім, я не мела. Нават слаба верыла, што за адзін дзень мне ўдасца асвоіць і ахапіць усё адразу. Але за працу ўзялася з імпэтам. Мы дамовіліся, што на працоўнае месца я выйду заўтра ж, паколькі працаваць будзе тая ж змена. А са знаёмымі людзьмі прасцей адаптавацца да абставінаў.

Працоўны дзень афіцыянта афіцыйна пачынаецца з 9 раніцы і працягваецца 12-13 гадзін у суткі. Але прыходзіць ім даводзіцца раней, каб паспець пераапрануцца і падрыхтавацца да працы. Спецыяльна для мяне выдзелілі форму, у якой я, дарэчы, напачатку адчувала сябе неяк няёмка. Можа з-за спадніцы, якая мне падавалася вельмі кароткай. Да яе прывыкнуць было асабліва цяжка, паколькі ў паўсядзёнцы я часцей хаджу ў джынсах. Так зручней. А тут цэлы дзень вось так, няёмка... Першае, з чаго афіцыянт пачынае свой працоўны дзень — падрыхтоўка залы да сустрэчы «гасцей». Менавіта так прынята называць наведвальнікаў кавярні. Я заўсёды блытала «гасцей» з «кліентамі», за што неаднаразова атрымлівала «па шыі» ад адміністратара Святланы Генадзьеўны. Гэта жанчына пільна сачыла за нашай працай на працягу ўсяго дня.

> **Калі афіцыянт прыгожа, цікава і ўмела ўсё раскажа, магчымасць зарабіць больш «чаю» ўзрастае. Гасцям падабаецца размаўляць з афіцыянтамі, жартаваць.**

Пасля таго, як зала была падрыхтаваная да сустрэчы гасцей, старэйшая афіцыянтка Ірына ўзялася вучыць мяне мастацтву заварочвання сталовых прыбораў у сурвэткі. Прызнаюся, на практыцы гэта было больш склада, чым ва ўяўленні. У мяне, чамусьці, увесь час сурвэткі не хацелі трымацца на лыжках. Ірына, добрай душы чалавек, падказала мне, што ражок трэба трохі падгінаць. Тады ўсё надзейна ляжыць на сваім месцы. Наступным этапам майго навучання стала вывучэнне меню, якое, аказваецца, трэба ведаць на памяць. Разам з цэнамі. Гэта на выпадак, калі госцю захочацца спытацца вашага меркавання наконт той або іншай стравы. Калі афіцыянт прыгожа, цікава і ўмела ўсё раскажа, магчымасць зарабіць больш «чаю» ўзрастае. Гасцям падабаецца размаўляць з афіцыянтамі, жартаваць. І, калі хочаш атрымаць больш грошай, даводзіцца смяяцца з гэтых жартаў, нават, калі яны і не надта ўмелыя і дасціпныя. Дарэчы, псіхалогія ў гэтай сферы — рэч даволі неабходная. І супрацоўнікі спасцігаюць гэту навуку не па падручніках, а па жывых людзях, іх характарах, паводзінах... Аналітычны розум на такой працы становіцца надзейным памочнікам.

Пасля кароткага экзамену па меню, якое я вывучала дзесьці каля гадзіны, мне дазволілі прыняць заказ. Праўда, толькі пад наглядам старэйшай афіцыянткі Ірыны. Яна пусціла мяне на сваю зону (афіцыянты дзеляць залу па зонах, каб было лягчэй арыентавацца ў прасторы). У рэале ж браць заказы дазваляецца толькі праз 2-3 тыдні пасля паступлення на працу. За гэты час даецца магчымасць пазнаёміцца са спецыфікай працы афіцыянта, прайсці экзамен па меню, разабрацца ва ўсіх стравах. Гэтыя тыдні — так званая стажыроўка, падчас якой людзі вызначаюцца, ці падыходзіць ім абраная праца. Многія не вытрымліваюць і збягаюць амаль што адразу. Маімі гасцямі аказаліся два юнакі-спартсмены, якія толькі-толькі з трэніроўкі забеглі да нас у кавярню на перакус. Ім так хацелася есці, што пачакаць нават 5 хвілін для іх было цяжкавата. Таму яны і стараліся заказаць тое, што гатуецца як мага хутчэй. Пытанні сыпаліся адно за адным. І наўрад ці я змагла б з імі справіцца, каб не старэйшая афіцыянтка Ірына. Яна ведае меню на зубок, таму адказы на ўсе пытанні хлопцаў выдавала хутка, нават не задумваючыся. Наступны этап — змаганне з супрацоўнікамі кухні, якія, чамусьці, заўсёды раздражнёныя. Чарговы заказ іх не абрадаваў, а, хутчэй, наадварот. Замест абяцаных 10 хвілін хлапцам давялося чакаць 20. Праўда, склалася ўражанне, што гэтай затрымкі яны і не заўважылі, бо былі вельмі занятыя абмеркаваннем нейкіх там спартыўных навінаў.

Калі на пачатку працоўнага дня афіцыянты можна сказаць змагаліся за кожнага госця дзеля таго, каб зарабіць больш, то пад канец іх імпэт знікае. Дзяўчаты пачынаюць прапаноўваць адна адной свае столікі. І радуюцца, калі зала раптам становіцца пустой. Наступае канец змены і адчуваецца набліжэнне выхадных дзён. Звычайна афіцыянты працуюць па графіку 2 праз 2, радзей 3 праз 3. Па 12 гадзін у суткі ім даводзіцца праводзіць на нагах. Я на сабе адчула ўсю «смакату» гэтай працы і цяпер разумею, што гэтым дзяўчатам грошы даюцца не так лёгка, як падаецца на першы погляд. Мой працоўны дзень у кавярні прынёс мне 20 000 беларускіх рублёў «чаю». Нядрэнна, калі ўлічваць, што практыка ў мяне ў гэтай сферы нулявая. Але, акрамя грошай, я зарабіла моцны боль у нагах, галаве і руках. Ды наогул ва ўсім целе. Як сказала Святлана Генадзьеўна, гэта з непрывычкі. Так звычайна бывае амаль што ва ўсіх. За час працы дзяўчаты прывыклі да яе спецыфікі, таму ўсіх гэтых сімптомаў проста не заўважаюць.

Працоўны дзень скончыўся — дзень вопыту, які дазволіў мне атрымаць новыя веды, новых знаёмых і новыя ўражанні. І, магчыма, зразумець, што працаваць трэба там, дзе твае навыкі насамрэч неабходныя. І толькі ў тым выпадку, калі гэтымі ўменнямі ты валодаеш, калі не ідэальна, то хоць бы якасна. Мабыць, менавіта разуменне таго, што ў нечым ты яшчэ не бездакорны, і прымушае рухацца наперад, шукаць спосабы для самаўдасканальвання. А гэта не такі слабы паказальнік у нашым бесперапынным грамадска-актыўным жыцці.

**Адзін дзень з новай сферы занатавала студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

Жыллё

# АРЭНДА Ў ЧАКАННІ СТУДЭНЦКАГА АЖЫЯТАЖУ

**У той час, калі на сталічным другасным рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца ўпэўненае патанненне, на рынку арэнды кватэр «запрацавалі» ўжо іншыя тэндэнцыі, якія спрыяюць стабілізацыі цэннікаў, а летам — чарговаму падаражанню арэнды.**

### Прапанова значная, аднак якасных кватэр не хапае

Сёння самыя слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры са старой мэбляй ці часткова з мэбляй можна адшукаць па кошце каля 200 долараў у Заводскім раёне і Шабанах.

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬША**, сярэдні кошт арэнды маленькіх кватэр уздоўж лініі метро складае 250 долараў. Кватэры крыху далей ад станцый метро каштуюць ужо каля 220—230 долараў, а ў новабудоўлях і ўвогуле без мэблі — усяго 200—210 USD.

У цэнтры сталіцы звычайная аднапакаёўка каштуе ўжо не менш за 300, а цэннік сапраўды якасных кватэр з сучасным еўрарамонтам дасягае тут 600—700 долараў. Двухпакаёвыя кватэры без мэблі ў новабудоўлях прапануюцца за 250 долараў. Прыкладна за 300—350 долараў прапануюцца двухпакаёвыя кватэры ў спальных раёнах. Бліжэй да цэнтра стандартныя «двушкі» могуць каштаваць і да 400 долараў, аднак... Сёння аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры, галоўным чынам, прапануюцца кватарантам у старых дамах. Гэта «хрушчоўкі» і «брэжнеўкі» са старой мэбляй і абсталяваннем савецкага часу. Такое жыллё цяпер карыстаецца невялікім попытам. А вось кватэр сярэдняй якасці бліжэй да лініі метро сёння зноў не хапае.

Усё часцей трохпакаёвыя кватэры прапануюцца ў арэнду па кошце двухпакаёвых апартаментаў. Зусім пустыя трохпакаёвыя кватэры ў новабудоўлях магчыма адшукаць за 250 долараў плюс аплата камунальных паслуг, або за 300 долараў за тое жыллё, дзе ёсць абсталяваная кухня. Практычна ва ўсіх мікрараёнах сталіцы арэнда трохпакаёвак не перавышае 300—350 долараў.

Што датычыцца элітных кватэр з дызайнерскім рамонтам і сучаснай мэбляй, то іх кошт даволі значны. Цэннік арэнды такіх двухпакаёвых кватэр дасягае 600—800 долараў. Сапраўды якасныя трохпакаёвыя кватэры элітккласа ў цэнтры каштуюць ад 700 і да 2,5—3 тысяч долараў. Іна Кульша ўпэўненая, што такое жыллё здымаюць не грамадзяне Беларусі, а замежныя госці сталіцы. Дарагое элітнае жыллё сёлета арандуецца для кіраўнікоў рознага кшталту замежных кампаній, буйных бізнэсменаў з Расіі, работнікаў пасольстваў заходніх краін і Расіі.

### Маладыя сем'і шукаюць якаснае жыллё

Апошняй новай тэндэнцыяй на рынку арэнды сталіцы з'яўляецца тое, што маладыя сямейныя пары заказваюць у агенцтвах не вельмі дарагое, але абавязкова якаснае жыллё. Цяпер кватэры з якасцю мэблі і абсталявання на ўзроўні «бабулькіных» стандартаў іх ужо не задавальняюць. «Прасунутыя» маладыя пары жадаюць жыць у кватэрах з сучаснымі шклопакетамі, дзе ў пакойчыках ламінат ці паркет, не вельмі старая кухня, ёсць тэлевізар, пыласос, пральная машына, а таксама шафа-купэ. Аднапакаёвыя кватэры такой камплектацыі цяпер каштуюць не менш за 300—350 долараў.

### Існуе вялікі попыт на якасныя катэджы

Прыкладна з красавіка на рынку арэнды трымаецца ўпэўнены попыт на сезонную арэнду якасных сучасных катэджаў коштам да 1,5 тысячы долараў за месяц. Існуюць і крыху «слабейшыя» катэджы, цэннік якіх вагаецца ў межах ад 500 да 800 долараў. Так, сёлета адна замежная кампанія афарміла арэнду шыкоўнага сучаснага катэджа, кошт якога на месяц склаў разам з абслугоўваннем каля 7,5 тысячы долараў.

Жыхары сталіцы пачалі ў маі здымаць на лета звычайныя дачы коштам 100—150 долараў. Такое сезоннае жыллё звычайна знаходзіцца на тэрыторыі садаводчых таварыстваў у межах 30-кіламетровай зоны ад сталіцы. Зусім слабенькія дачы або жыллё крыху далей ад Мінска могуць каштаваць цяпер да 50 долараў за месяц.

### Даражэць будзе цэнтр і танныя кватэры

Іна Кульша ўпэўненая, што масавая хваля актыўнасці студэнтаў на рынку арэнды жылля пачнецца прыкладна з сярэдзіны ліпеня. Багатых першакурснікаў звычайна цікавяць кватэры бліжэй да цэнтра ці жыллё ўздоўж лініі метро. Ужо традыцыйна летам там жыллё даражэе прыкладна на 30—50 долараў. Разам з тым, у апошнія гады кватэры з больш-менш якасным рамонтам студэнтам ужо не здаюцца. Усё часцей студэнты здымаюць менавіта невялікія кватэры са старой мэбляй у пяціпавярховых дамах спальных раёнаў. Павялічаны попыт на такія слабенькія і танныя кватэры можа ў жніўні падняць іх кошт прыкладна на 20—30 долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АЎТАСТОП: нам па дарозе!

**На чужых машынах ездзіў кожны з нас, на аўтамабілі брата, суседа, сваяка ці проста на таксі. Часам прыходзілася плаціць за паездку, часам — не. Але па сутнасці гэта тая ж «папутка», розніца толькі ў тым, што кіроўца — знаёмы вам чалавек ці той, хто займаецца адпаведнай працоўнай дзейнасцю.**

На «папутках» я ўжо вельмі даўно езджу дамоў з вучобы, хоць і жыву недалёка ад Мінска — усяго за 30 кіламетраў. Для мяне гэта самы зручны варыянт. Дарога займае ўсяго 20 хвілін, у той час як на аўтобусе прыйшлося б затраціць больш за гадзіну, ды і грамадскі транспарт у мой населены пункт ездзіць толькі 2-3 разы на дзень па раскладзе. Яшчэ адзін плюс майго выбару — што гэта даволі танна (3 тысячы рублёў) і камфортна, не прыходзіцца стаяць усю дарогу на адной назе і трымаць у руках цяжкія сумкі.

Калі пра тое, што я выкарыстоўваю аўтастоп у якасці транспарту, даведаліся мае сябры, моцна здзівіліся і глядзелі на мяне велізарнымі вачыма, маўляў, а што калі маньяк які ці злодзей?! Але я да такіх выразаў ужо прывыкла і амаль што не звяртаю ўвагі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Акцыі БРСМ

# А ТЫ кінуў КУРЫЦЬ?

**У рамках моладзевага руху «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» ва ўсіх рэгіёнах краіны гэтымі днямі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі праводзіць акцыю «Моладзь без тытуню». Як адзначыла загадчыца аддзела праектнай дзейнасці ЦК БРСМ Нэлі БОБРЫК, такія мерапрыемствы запатрабаваныя ў маладых.**

— Нагадаю, — кажа Нэлі Бобрык, — моладзевы рух «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» стартаваў 18 сакавіка. Ён накіраваны на фарміраванне «моды» на здаровы лад жыцця, прафілактыку тытунёвай, алкагольнай, наркатычнай залежнасці і аб'ядноўвае тых, хто лічыць, што яго асабістае здароўе, здароўе яго сям'і і сяброў — важныя арыенціры. Лакаматывам руху выступае Рэспубліканскі студэнцкі савет пярвічных арганізацый БРСМ вышэйшых навучальных устаноў. Студэнты арганізоўваюць у родных альма-матар і студэнцкіх інтэрнатах навамодныя і крэатыўныя міні-акцыі: «Рэалізуйце сваё права на здароўе!», «Здароўе — гэта крута! Здароўе — гэта драйв! Здаровы лад жыцця хутчэй выбірай!», «Дай шанц здароўю!» і шмат іншых. У рамках руху «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» БРСМ праводзіць мерапрыемствы па развіцці моладзевага і дзіцячага спорту, аздараўленні, рэалізуе праекты і праграмы, накіраваныя на прафілактыку негатыўных з'яў у моладзевым асяроддзі, барацьбу са шкоднымі звычкамі і пагрозай залежнасці ад іх. Гэта шматлікія спартакіяды, турпаходы і турзлёты, акцыі «Кніга супраць тытуню!», «Мяняю цыгарэту на цукерку», «Не курэнню!», «Забі на цыгарэту!», «Кірмаш здароўя». Напрыклад, да сусветнага дня здароўя моладзевы саюз ва ўсіх рэгіёнах правёў тыдзень здароўя. БРСМ арганізаваў шырокую інфармацыйную кампанію па пытаннях, якія датычыліся тэматыкі Сусветнага дня здароўя, з прыцягненнем спецыялістаў, а таксама правёў фізкультурна-аздараўленчыя і забаўляльныя мерапрыемствы, спартыўныя спаборніцтвы, «маршы здароўя», канцэрты, конкурсы і выставы, у тым ліку з удзелам дзяцей, кампаніі па прыбіранні і азеляненні тэрыторый, акцыі па абмежаванні спажывання тытуню, абмежаванні выкарыстання аўтамабіляў. Фінальным мерапрыемствам тыдня здароўя стала рэспубліканская акцыя «Лабараторыя здароўя!».

Яшчэ хочацца заўважыць, што сумесна з Міністэрствам унутраных спраў у сакавіку праведзены акцыі «Разам за бяспеку і правапарадак», «Вуліцы без алкаголю». На мінулым тыдні ў Брэсце стартавалі рэспубліканскія спаборніцтвы па гандболе «Імклівы мяч». Па ўсёй краіне ладзяцца рэгіянальныя этапы спаборніцтваў для дзяцей і падлеткаў па футболе «Скураны мяч» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Мы традыцыйна праводзім фестываль здаровага ладу жыцця «Алімпія» ў Валожынскім раёне Мінскай вобласці.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Аўташкола ад «А» да «Я»

# КРОК 1: БЯСПЛАТНАЯ ПЛАТНАЯ МЕДЫЦЫНА...

## альбо, Як я праходзіў медкамісію

(Працяг. Пачатак у нумары «ЧЗ» ад 12.05.2010)

**Кожны аўтааматар, паводле новых правілаў, павінен праходзіць медыцынскі агляд не менш як адзін раз на пяць гадоў. Здавалася б, што цяжкага: сабраць некалькі даведак, запісацца на пэўны дзень і, нарэшце, аднаго за адным пакінуць за дзвярыма ўрачоў, атрымаўшы такі патрэбны вам дакумент. У мяне ж, аднак, гэты працэс заняў ні многа ні мала — паўгода...**

У студзені я зноў выправіўся ўжо ў другі паход па медыцынскую даведку прыдатнасці да кіравання легкавымі аўтамабілямі класу «В». Цяпер я рашуча настроіўся атрымаць патрэбную мне паперку — зразумела, першым крокам трэба было запісацца ў паліклініку на праходжанне медкамісіі. На дзіва, работнікі даведкі самай першай медыцынскай установы, у якую я звярнуўся, прапанавалі мне запісацца ўжо на наступны тыдзень, а ў Спецыялізаванай ажно праз некалькі дзён. Не трэба і казаць, што я не змарудзіў скарыстацца такой магчымасцю — і ўжо праз дзень я праехаўся ў цэнтр сталіцы, каб пазначыць сваім прозвішчам пэўны час у сшытку для запісаў.

Але так выпала (варта сказаць, ніяк не ўласціва працоўным журналісцкага цэха), што ў гэтую самую ўстанову я ездзіў яшчэ тры разы толькі з-за сваёй няўважлівасці (ну, і яшчэ дадаткова пяць-шэсць іншых прычынаў): першым разам я натуральна забыўся на час, бо не меў з сабой ніякага кавалка паперкі, каб занатаваць час прыёму; другім разам запісаўся на той дзень, калі мяне проста не магло быць у горадзе; і нарэшце, трэцім разам я забыўся пра... пашпарт.

Праз цэлы тыдзень паездак «туды-сюды» я ўсё ж, сціснуўшы волю ў кулак, прыхапіўшы з сабой усе неабходныя дакументы, патрапіў у прыёмную паліклінікі. І тут мяне чакала яшчэ адно цікавае паведамленне медрэгістратара:

— А вашы выпіска з амбулаторнай карткі ды даведкі з наркалагічнага і псіханеўралагічнага дыспансэраў ужо два тыдні як несапраўдныя! Дарэчы, на «Гастэла» можаце не ехаць — вы ж без права наймання...

«А каб вас качкі! — толькі і заставалася думаць мне, ідучы зноў па тым самым шляху, які мне ўжо аднойчы давялося прайсці восенню. — Зноў усё з пачатку!..

На шчасце, цяпер мая сітуацыя спрасцілася тым, што адна з даведак у мяне ўжо была. Што ж датычылася выпіскі, то тут я вырашыў крочыць у дамедычны кабінет з пратэрмінаваным дакументам і з просьбай банальна перапісаць старую ў новую... Такім чынам, праз тры дні ўсё зноўку было падрыхтаванае і мой подпіс стаяў побач з вызначаным часам у выбранай паліклініцы.

Што трэба зрабіць, каб не прайсці медкамісію, і чаму ты ўсё роўна, якім бы хворым ні быў, трапіш у армію? Тады я пра гэта яшчэ не думаў. Але ж менавіта гэтае пытанне стане ці не галоўнай сюжэтнай лініяй, што разыгрывалася надалей.

У прызначаны час я заплаціў недзе блізу 20 тысяч рублёў і рушыў у агульную чаргу. Там, мінаючы адзін кабінет за другім, давялося прайсці ўсіх урачоў, якія толькі і пыталіся, ці ўсё ў мяне нармальна, і ставілі пячаткі з надпісам «прыдатны». Такая ідылія цягнулася роўна 25 хвілін, пакуль я не завітаў у апошнюю інстанцыю — кабінет тэрапеўта. Распрануўшыся, прыходзілася распавядаць: на што хварэў і як? І вось на адным пытанні выйшла нешта незразумелае:

— Ці была ў вас страта прытомнасці?

— Не ведаю... Можа так, а можа і не... — чаму ж мяне чорт за язык пацягнуў?!

— О! Гэта наш кліент! Вось вам накіраванне на праходжанне абследавання: калі пройдзеце, тады і даведку выдадзім.

— Як? Вы што, жартуеце? Я ж цалкам здаровы! — не верыў я таму, што адбываецца.

— Вы сказалі, што страчвалі прытомнасць, а ў нас гэта супрацьпаказанне! — настойвала тэрапеўт.

— Я сказаў, што не ведаю! Бо адкуль я магу ведаць, што адбывалася ў раннім дзяцінстве?!




— Гэта вашы праблемы: вы сказалі — я пачула. Не хочаце рабіць абследаванне, не атрымаеце даведку!..

Фактычна гэты апошні сказ, які я пачую яшчэ не аднойчы, азначаў: хочаце атрымаць даведку, плаціце грошы!

Але ж ці можна зрабіць тыя абследаванні ў бясплатнай паліклініцы? Так, але для гэтага, цытата: «Прыйдзецца запісвацца за месяц наперад». Дык ці задаволіць гэта чалавека, які ўжо і так досыць намучыўся, збіраючы патрэбныя дакументы? Адказ відавочны!.. Мяне ж не задаволіў ані першы, ані другі варыянт...

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

**(Працяг будзе.)**

### Анекдот у тэму:

*— У нас у ДАІ нейкіх разумова-адсталых бяруць...*

*— Чаму гэта?*

*— А яны стаяць уздоўж дарогі і тармозяць, тармозяць, тармозяць...*

## ХОЧАШ СТАЦЬ ГАНАРОВЫМ ГРАМАДЗЯНІНАМ? СТАНЬ ІМ!

Унікальны музей, прысвечаны ганаровым грамадзянам Віцебска, адкрыўся ў абласным цэнтры. Славуты партызанскі камандзір Мінай Піліпавіч Шмыроў (бацька Мінай), нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў, легендарны баксёр — алімпіец Вячаслаў Яноўскі, народны артыст СССР, акцёр Фёдар Іванавіч Шмакаў, касманаўт Валянціна Церашкова і іншыя ў розныя гады атрымалі гэтае ганаровае званне. Пачынаючы з 1964 года, ганаровымі грамадзянамі Віцебска сталі каля пяцідзесяці чалавек.

Цяпер, дзякуючы намаганням настаўнікаў і вучняў віцебскай сярэдняй школы № 12, у гонар іх адкрылася цікавая экспазіцыя. Сярод экспанатаў — стужка ўладальніка звання ганаровага грамадзяніна, палажэнне аб «статусе», асабістыя рэчы і дакументы. У музеі, які адкрыўся ў школе, можна прачытаць пра заслугі людзей, якіх прызналі ганаровымі віцябчанамі. І, хто ведае, мо школьнікі, якія збіралі разам з настаўнікамі экспанаты, ці наведвальнікі музея таксама паспрабуюць стаць ганаровымі грамадзянамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Хто стане «Міс ІнтэрREGIONаль»?

**Мінская абласная арганізацыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі правяла шоу-прэзентацыю «Сапраўдная лэдзі не мае патрэбы ў рэкламе, але...» мегапапулярнага моладзевага фотапраекта «Міс ІнтэрREGIONаль». Як заўважыў галоўны рэдактар інтэрнэт-партала «Моладзь Міншчыны» Павел Сырыцкі, гэта не конкурс прыгажосці, гэта конкурс асобы.**

— Гэта — 140 тысяч праглядаў, 80 тысяч галасоў, 1 тысяча 200 каментарыяў з падтрымкай удзельніц, — кажа Павел Сырыцкі. — Моладзевы фотапраект «Міс ІнтэрREGIONаль» стартаваў у сакавіку на інтэрнэт-партале «Моладзь Міншчыны» (www.brsmOK.by) і проста «падарваў» інтэрнэт. Як стала бачна, новы праект быў даспадобы не толькі моладзі Міншчыны, але і многім маладым беларусам з іншых рэгіёнаў Беларусі і нават з-за мяжы.

Ідэя конкурсу ў тым, што тут выбіраюць не проста самую прыгожую дзяўчыну, гэта — конкурс актыўнай жыццёвай пазіцыі. У рэгіёнах Мінскай вобласці (а гэта 23 раёны) прайшлі адборачныя туры, у іх узялі ўдзел каля 600 прэтэндэнтак. У выніку на абласны этап былі адабраны 24 прыгажуні (23 ад рэгіёнаў і адна — пераможца конкурсу «Маладыя журналісты», якая мела права ўдзелу ў конкурсе без адбору). І ўжо ў першы тыдзень у нас было каля 10 тысяч наведвальнікаў сайта. Галасаваць увогуле можна было на працягу трох месяцаў, да 30 мая. А гэта значыць, што ўжо хутка будуць вызначаны пераможцы. Напярэдадні ў адным са сталічных клубаў прайшла шоу-прэзентацыя. У ёй бралі ўдзел 10 дзяўчат — лідараў інтэрнэт- і SMS-галасавання. Дзяўчаты сталі ўдзельніцамі творчых і інтэлектуальных конкурсаў, паспрабавалі свае сілы ў якасці мадэляў, пазнаёмілі са сваімі сацыяльнымі праектамі

***— Пакуль у лідарах 10 дзяўчат, як будзеце вызначаць пераможцу?***

— Пераможца будзе вызначана па сукупнасці трох паказчыкаў інтэрнэт- і SMS-галасавання і меркавання журы. А ў яго складзе вядомыя ў краіне мужчыны — Пётр Елфімаў, Іван Вабішчэвіч, Саша Варламаў і іншыя. Пераможца будзе вызначана ў сярэдзіне чэрвеня ў адным са сталічных клубаў. Акрамя таго, будзе вызначаны шэраг намінацый. Дарэчы, ад усіх заснавальнікаў конкурсу падрыхтаваныя спецыяльныя каштоўныя і цікавыя прызы. Гэтыя дзесяць дзяўчат маюць вялікі адрыў ад астатніх. Разам з тым, паміж імі ідзе напружаная барацьба. Кожны дзень перавага змяшчаецца то ў адзін, то ў другі бок.

***— Чаму вы вырашылі правесці менавіта такі конкурс?***

— Нам было цікава прадэманстраваць на ўзроўні рэгіёнаў, што весці здаровы лад жыцця, самарэлізоўвацца, праяўляць свае творчыя здольнасці — больш цікава і важна, чым бавіць час перад тэлевізарам. Акрамя таго, хацелася паказаць вялікай колькасці моладзі, асабліва цяжкім падлеткам, як важна займацца сваім самаўдасканальваннем, а не схіляцца да асацыяльных учынкаў. На мой погляд, гэта мэта была дасягнутая. Шмат каментарыяў на сайце пакінулі прадстаўнікі рэгіёнаў, якія імкнуліся падтрымаць сваю прадстаўніцу. А гэта значыць, што дзяўчаты трапілі на конкурс невыпадкова і гэта лепшыя прадстаўніцы свайго рэгіёну.

**А пакуль у юнакоў яшчэ ёсць магчымасць аддаць голас за ўпадабаную дзяўчыну. Хто ведае, можа, ваш голас стане вырашальным?**

**Святлана СУХАРКО.**

# АЎТАСТОП: нам па дарозе!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Для тых, хто не ведае ці яшчэ не паспеў зразумець, аўтастоп — гэта спосаб перамяшчэння з аднаго пункту ў другі на спадарожным транспарце. Некаторыя робяць гэта дзеля таго, каб проста куды-небудзь дабрацца, іншыя практыкуюць такі спосаб вандравання. Але і тыя, і іншыя прытрымліваюцца асобных правілаў, парушаць якія — сабе даражэй. З асабістага вопыту дам некалькі парадаў тым аматарам усяго новага, якія ўсё ж такі збяруцца куды-небудзь аўтастопам.

Не бярыце з сабой шмат рэчаў. Па-першае, вам самім будзе нязручна дабірацца да таго месца, дзе вы збіраецеся галасаваць, па-другое, кіроўцаў машын, а значыць — вашых патэнцыяльных спадарожнікаў, ваша «загружанасць» наўрад ці падштурхне спыніцца менавіта каля вас.

Месца для спынення аўтамабіля трэба выбіраць вельмі сур'ёзна. Зразумела, што калі вы збіраецеся ехаць далёка ад горада, спачатку трэба выбрацца за яго межы, бо на праспекце вы ў лепшым выпадку «зловіце» якую-небудзь «маршрутку» ці таксі, а то і застанецеся ні з чым. Звычайна на выездзе з горада можна сустрэць шмат спадарожнікаў, так што едзем на ўскраіну і ідзём туды, дзе шмат людзей з адведзенай убок правай рукой (некаторыя яшчэ паднімаюць угару вялікі палец: жэст, які скажа аўтааматарам, што вы — «аўтастопшчык»). Не забывайце звяртаць увагу яшчэ і на тое, ці можна там, дзе вы знаходзіцеся, спыняцца машынам, ці няма паблізу знака «Прыпынак забаронены». Не стойце таксама на спуску з горкі ці на яе пад'ёме. Станьце там, дзе кіроўцу будзе зручна зрабіць прыпынак.

Не выбірайце, старайцеся спыніць любую машыну. Лепш калаціцца ў старэнькім «масквічы», чым прастаяць паўдня на абочыне дарогі або прамокнуць пад даждждом. Некаторыя лічаць, што лепшага спадарожніка не знайсці, чым дальнабойшчыка але, як правіла, іх можна сустрэць толькі на буйных аўтамагістралях.

Не забудзьцеся пра сваю бяспеку. Спыніўшы машыну, звярніце ўвагу на кіроўцу: якніяк вам з ім ехаць не адзін дзясятак кіламетраў. Будзьце абачлівымі: таксама спытайце, куды едзе ваш патэнцыйны спадарожнік, а пакуль вам адказваюць, паглядзіце, ці не чуваць у кабіне паху алкаголю. Акіньце вокам таксама і салон аўтамабіля: як правіла, добрасумленны, акуратны кіроўца не будзе ездзіць у непрыбранай машыне, і гляньце таксама, ці няма ў салоне падазроных рэчаў (нажа, шпрыцоў, бутэлек з-пад спіртнога і г. д.). Калі вам не спадабаўся выгляд, пах ці ў вас проста дрэннае прадчуванне — не садзіцеся ў аўтамабіль, а кіроўцу скажыце, што пачакаеце іншай машыны, якая падвязе вас далей ці ў больш зручнае месца. Вы не абавязаныя ехаць з гэтым кіроўцам толькі таму, што ён каля вас спыніўся. Не забывайце пра ветлівасць, усміхайцеся, але і не здайцеся даверлівымі, як малое дзіця.

Для «аўтастопераў» любое надвор'е — добрае надвор'е. Гэта здаецца глупствам, але моцны дождж можа павялічыць шанцы хутчэй спыніць аўто. Вы будзеце выглядаць настолькі жаласна, што наўрад ці які-небудзь кіроўца праедзе міма.

Яшчэ некалькі слоў наконт бяспекі. У дарозе могуць здарыцца розныя сітуацыі, таму лепш мець пры сабе які-небудзь сродак самаабароны, медыцынскую аптэчку. Перад паездкай абавязкова патэлефануйце родным ці сябрам і скажыце, дзе вы знаходзіцеся. Гэта ж можна зрабіць і ў час падарожжа: па-першае, каб кіроўца зразумеў, што вас ведаюць дзе і з кім шукаць, па-другое, каб за вас ніхто не хваляваўся.

«Аўтастоперам», асабліва пачаткоўцам, безумоўна, лепш не ездзіць у адзіночку. Як паказвае мой вопыт, хутчэй за ўсё кіроўцы спыняцца каля пары, г. зн. дзяўчыны з хлопцам. Кампанія маладых дзяўчат можа «нарвацца» на такую ж кампанію маладых людзей ці мужчын, што можа дрэнна скончыцца. Увогуле, лепш за ўсё ездзіць па 2-3 чалавекі, большая кампанія ніяк не сядзе ў машыну.

Дададзім, што аўтастоп — вельмі цікавы спосаб паездак. Галоўным плюсам можна лічыць магчымасць пазнаёміцца з цікавымі людзьмі. Мне, напрыклад, сустракаліся экстрасэнс, які прадказаў будучыню, дырэктар, які прапанаваў працу на прадпрыемстве. Даўно забытых знаёмых было не менш прыемна сустрэць, а колькі разоў прапаноўвалі выйсці замуж, нават і не злічыць... Да таго ж паездка на спадарожным аўто часта можа быць самым хуткім, танным і зручным варыянтам.

Так што паспрабаваць можна, раптам спадабаецца? Таму — шчаслівай дарогі!!!

**Вольга КАРОЛЬ,**
**студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

# МІНСКАЯ МОЛАДЗЬ АТРЫМАЛА ДАДАТКОВЫ ШАНЦ

## працаўладкавацца ці пачаць свой бізнэс

**Шматпрофільны цэнтр па садзейнічанні занятасці моладзі і развіцці моладзевага прадпрымальніцтва быў адкрыты нядаўна ў беларускай сталіцы. Гэта было зроблена ў рамках праекта «Папярэджанне, барацьба і мінімізацыя сацыяльных наступстваў у галіне гандлю людзьмі ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізоўваецца сумесна Праграмай развіцця ААН і Міністэрства ўнутраных спраў пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза і ЮНІСЭФ. Сам жа шматпрофільны цэнтр быў адкрыты з дапамогай Мінгарвыканкама на базе КУП «Моладзевая сацыяльная служба», якая знаходзіцца на вуліцы Чапаева, 3.**



**Гай МАЕЎСКІ, заснавальнік ТАА «ДыДжы Арт», размешчанага ў моладзевым бізнэс-інкубатары. Гай разам са сваім сябрам Яўгенам Андрэевым ужо не проста студэнты БДУ, а заснавальнікі свайго малога бізнэсу — робяць на заказ вэб-сайты. Справы яны вядуць з канца лютага і таму атрымаць прыбытак яшчэ не паспелі, але ўжо маюць нямала заказаў.**

— Стварэнне цэнтра стала першай ініцыятывай у Беларусі, накіраванай на ліквідацыю адной з прычын гандлю людзьмі — беспрацоўя сярод моладзі — пры дапамозе пашырэння магчымасцяў для працаўладкавання і развіцця моладзевага прадпрымальніцтва, — сказаў на адкрыцці шматпрофільнага цэнтра **Антоніус БРУК, прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі**.

Ён жа расказаў, што з бюджэту праекта на развіццё цэнтра выдзелена каля 200 тысяч еўра, а таксама што за сродкі праекта закуплена офіснае абсталяванне, аргтэхніка, мэбля, супрацоўнікі цэнтра з'ездзілі ў Берлін для пераймання вопыту. Таксама спадар Брук выказаў спадзяванні, што цэнтр дакажа сваю эфектыўнасць і яго паспяховая практыка будзе распаўсюджана і на іншыя рэгіёны Беларусі.

Чым жа будзе займацца новы шматпрофільны цэнтр? Як расказала **Ірына СКОРЫНА, намеснік дырэктара КУП «Моладзевая сацыяльная служба»** і каардынатар гэтага шматпрофільнага цэнтра, перад новай структурай падтрымкі моладзі пастаўлена некалькі задач. Прынамсі, гэта бясплатныя кансультацыі па працаўладкаванні, прававых пытаннях і прадпрымальніцтве, гэта цэлая серыя трэнінгаў і семінараў наконт працаўладкавання і адкрыцця сваёй справы, а таксама магчымасць на льготных умовах пачаць свой бізнэс у інкубатары моладзевага прадпрымальніцтва.

— У Мінску сярод двухмільённага насельніцтва моладзь складае болей за 480 тысяч, болей за палову з якіх вучацца ў ВНУ, а астатнія працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях горада. Мы разумеем, што сутнасць дзяржаўнай палітыкі не ў бясконцым абвяшчэнні пафасных ідэй, у гэта моладзь проста не паверыць, — перакананы **Віталь БРЭЛЬ, начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама**. — Наша праца заключаецца ў канкрэтных дзеяннях па рашэнні найбольш актуальных праблем.

Якраз з такімі канкрэтнымі праблемамі толькі ў 2010 годзе ў моладзевую сацыяльную службу звярнуліся каля 900 маладых людзей, з якіх 737 чалавек прасілі кансультацыю наконт працаўладкавання. У выніку — 203 чалавекі атрымалі сваё працоўнае месца. 42 чалавекі прыйшлі ў моладзевую службу па прававых пытаннях, а 39 чалавек прасілі парады наконт адкрыцця ўласнага бізнэсу.

Што датычыцца арганізацыі свайго бізнэсу, то любы малады чалавек можа прыйсці ў шматпрофільны цэнтр, распрацаваць бізнэс-план і, калі яго праект будзе ўхвалены на радзе моладзевага інкубатара, ён атрымае магчымасць скарыстацца паслугамі бухгалтара і юрыста, а таксама магчымасць арандаваць на выгадных умовах памяшканне пад офіс.

— У нашага бізнэс-інкубатара дакладная спецыфіка — моладзь. Такім чынам да нас можа звярнуцца любы грамадзянін ад 18 да 31 года, але прадпрыемства, якое першапачаткова асуджанае на няўдачу, мы, безумоўна, садзіць у інкубатар не можам, — тлумачыць Ірына Скорына. — Мы павінны, як інфраструктура развіцця прадпрымальніцтва, кантраляваць і працаваць з тымі прадпрыемствамі, якія будуць развівацца, плаціць дзяржаве падаткі, паказваць свае абароты, ствараць новыя працоўныя месцы і гэтак далей.

Дарэчы, моладзевы бізнэс-інкубатар размясціў ужо ў сябе дзесяць прадпрыемстваў, арганізатарамі і заснавальнікамі якіх сталі маладыя людзі: гэта фірмы па стварэнні сайтаў, SMS-рэкламе, пашыве жаночага адзення, пагруза-разгрузачных працах, прыбіранні памяшканняў, а таксама турыстычныя і будаўнічыя фірмы.

Усяго на сёння бізнэс-інкубатар мае магчымасці размясціць у сябе 31 прадпрыемства — такім чынам, вакантных месцаў для ініцыятыўных маладых людзей засталося толькі 21.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Патрабуецца дапамога

# ПАЖЫЦЬ ЗВЫЧАЙНЫМ ДЗІЦЯЧЫМ ЖЫЦЦЁМ

**У жніўні на базе Міжнароднага дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Надзея XXI стагоддзе», што ў Вілейскім раёне Мінскай вобласці, Беларускі дзіцячы фонд пяты раз запар плануе сабраць 40 дзяцей, якія перанеслі аперацыі на сэрцы. Адзіная ў Беларусі аздараўленчая змена для дзяцей з сардэчнымі захворваннямі «Вясёлыя сардэчкі» мае патрэбу ў падтрымцы добраахвотнікаў.**

Большая частка жыцця дзяцей з цяжкімі парокамі сэрца праходзіць у бальнічных палатах. Многія радасці звычайнага жыцця ім недаступныя. У такіх дзяцей абмежаваныя, як правіла, не толькі фізічныя нагрузкі, але і кола сяброў. «Вясёлыя сардэчкі» дазваляюць дзецям сумясціць адпачынак з аздараўленнем — масажам, ваннамі, душамі, сеансамі фіта- і водаратэрапіі, заняткамі ёгай. Для кожнага з дзяцей распрацоўваецца індывідуальная спартыўная праграма — прагулкі пешыя і на веласіпедах, катанні на водных веласіпедах і лодках, заняткі ў трэнажорнай зале. Дзецям прапануюцца экскурсійныя паездкі па гістарычных мясцінах Беларусі, гульнявыя праекты, конкурсы і гумарыстычныя шоу. Такім чынам «Вясёлыя сардэчкі» атрымліваюць магчымасць пажыць звычайным дзіцячым жыццём.

Для саміх дзяцей гэты адпачынак бясплатны, але для яго арганізацыі патрабуюцца грошы. Суткі пражывання ў цэнтры каштуюць 50 тысяч рублёў. Змена разлічана на 12 дзён. Арганізатары спрабуюць не абдзяліць дзяцей вітамінамі, садавінай, сокамі, прысмакамі, падарыць кожнаму дыск з фотаздымкамі, майкі і бейсболкі з сімволікай «Вясёлых сардэчкаў». У падтрымку гэтай праграмы сёлета ўжо выступіла сетка прадуктовых крамаў «Родны кут». З 15 чэрвеня па 15 ліпеня ва ўсіх крамах сеткі будзе праходзіць дабрачынная акцыя «Падары дзецям шчаслівае лета». З кожнай пакупкі на суму звыш 40 тысяч рублёў 500 рублёў пойдзе на аплату змены «Вясёлыя сардэчкі».

Кожны, хто хоча дапамагчы, можа звяртацца непасрэдна ў Беларускі дзіцячы фонд па нумарах: 290 62 67, 290 66 40. Разліковы рахунак 3015740146011, аддзяленне № 539 ААТ «Белінвестбанк» г. Мінска, код 739, УНН 100184002.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# А ТЫ КІНУЎ КУРЫЦЬ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

БРСМ падтрымаў таксама і рэспубліканскую акцыю Міністэрства аховы здароўя «Беларусь без тытуню» і ў рамках моладзевага руху «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» ініцыяваў правядзенне рэспубліканскай моладзевай акцыі «Моладзь без тытуню». У рамках акцыі запланавана безліч самых розных мерапрыемстваў. Напрыклад, 22 мая ў Пінскім гарадскім парку актывісты БРСМ прапаноўвалі мінакам узяць удзел у акцыі «Пакарай цыгарэту — захавай сабе жыццё», 25 мая ў Калінкавічах арганізавана SMS-акцыя «Перадай сябру паведамленне: курыць — здароўю шкодзіць».

А 31 мая ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» адбудзецца «Суд над тытунём». У прыватнасці, у Сусветны дзень без тытуню на пляцоўцы пад цэнтральным купалам гандлёвага цэнтра кожны зможа не толькі «забіць на цыгарэту», убіўшы ў стылізаванае пад цыгарэту бервяно вялікі цвік, але і стаць удзельнікам «суда над тытунём». На вачах мінакоў «вялікая імправізаваная мясарубка» будзе здрабняць тытунёвыя вырабы, сабраныя актывістамі БРСМ падчас акцыі «Абмяняй цыгарэту на цукерку». Акрамя таго, узамен на шкодную звычку ўдзельнікі моладзевага руху «Я люблю цябе, ЖЫЦЦЁ!» прапануюць мінчанам і гасцям сталіцы ўзяць удзел у «Сок-шоу» — шоу за здаровы лад жыцця. Яго ўмовы самыя простыя — уцягвай у сваё задавальненне сок праз саломінку, прыдумай за гэты час слоган сок-тэму, глядзіш — і атрымаеш тытул «Круты сок-шоумэн». Дадам, арганізатары «Суда над тытунём» падрыхтавалі яркія сюрпрызы для ўдзельнікаў акцыі, якія нікога не пакінуць абыякавым.

***— Такія антытытунёвыя акцыі БРСМ праводзіць не ўпершыню. Ці карыстаюцца яны папулярнасцю ў маладых?***

— Насамрэч маладыя людзі актыўна ўключаюцца ў гэтыя мерапрыемствы. На першы погляд, простая акцыя, але яна прыцягвае моладзь. Нават калі яна робіць гэта неасэнсавана. Такія акцыі — заклік да маладых, што курыць — гэта шкодна. І ў жыцці ёсць шмат цікавых рэчаў, якім трэба надаваць больш увагі.

***— Ці ёсць магчымасць у кожнага ўзяць удзел у вашых антытытунёвых акцыях?***

— Так, мы запрашаем усіх далучацца да нашай акцыі «Моладзь без тытуню». Не думайце, што ніколі не зможаце кінуць курыць. Не спяшайцеся з высновамі. Аднойчы, у той самы дзень, калі вы ўпершыню ўзялі ў рукі цыгарэту, вы ўжо паспяшаліся з рашэннем. Гады, якія вы аддалі шкоднай звычцы, вартыя таго, каб зрабіць асэнсаваны выбар. Далучайцеся да нашай акцыі! Мы чакаем вас на нашых мерапрыемствах.

**Святлана СУХАРКО.**




# ФОТА НА ТЭМУ ДЗЯЦІНСТВА

З нагоды

**З 27 мая па 1 чэрвеня ў НВЦ «БелЭКСПА» ў Мінску адбудзецца традыцыйная акцыя «Падорым дзецям свята!». Канцэрты, сустрэчы з вядомымі артыстамі, мастакамі, пісьменнікамі Беларускі дзіцячы фонд — арганізатар падзеі — наладзіў пры цесным супрацоўніцтве з юнымі талентамі, у тым ліку дзецьмі-сіротамі і дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі.**

На мастацкай выставе будуць дэманстравацца работы выхаванцаў студыі «Фарба» і школы № 12 г. Мінска, дзяцей-сірот з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу Сянцовых (г. Бабруйск), Рубан (г. Бабруйск), Карэба (в. Новыя Цярэшкавічы Гомельскай вобласці), Янкоўскай (г. Дзяржынск), дзяцей-сірот з Ветрынскай і Ястрамбельскай школ-інтэрнатаў, Аршанскага дзіцячага дома, дзяцей-інвалідаў з г. Ліды і дзяцей-інвалідаў, якія праходзяць лячэнне ў Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры, навучэнцы мінскіх цэнтраў пазашкольнай работы.

З канцэртнымі праграмамі выступяць на пляцоўцы «БелЭКСПА» творчыя студыі і харэаграфічныя калектывы Мінска. У дабрачынных канцэртах возьмуць удзел Уладзімір Сарокін, Іван Буслай, гурты «Тяни-Толкай» і «The project», а таксама Таццяна Молчан і дзіцячы тэатр эстраднай песні «Беларусінкі».

Упершыню ў межах акцыі адбудзецца конкурс фатаграфіі «4383 дні дзяцінства». Напярэдадні БДФ і сталічныя фотамастакі абвясцілі рэспубліканскі конкурс фатаграфіі на тэму дзяцінства. Каля 200 фатографаў з Беларусі, краін СНД і Еўропы даслалі 1,5 тысячы фотаработ. Пераможцамі сталі 10 мастакоў, якім найбольш дакладна і яскрава ўдалося зафіксаваць дзіўны, але часам зусім не бесклапотны свет дзяцінства. Адкрыццё выставы лепшых конкурсных работ запланавана на 28 мая.

Далейшая праграма працягнецца ў «БелЭКСПА» 29 мая ў 14.00, 31 мая ў 11.00, 1 чэрвеня ў 14.00. Фотавыстава лепшых конкурсных работ «4383 дні дзяцінства» будзе працаваць у гэтыя дні з 10.00 да 18.00. Уваход у выставачны цэнтр вольны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# МАГІЛЁЎСКАЯ ЭСТАФЕТА

**У Магілёве на цэнтральным стадыёне «Спартак» адбылося спартыўнае першынства абласнога цэнтра па эстафетным бегу.**

У спаборніцтвах брала ўдзел болей за 200 дзяцей з чатырох спартыўных школ горада, якія культывуюць лёгкую атлетыку. На маляўнічай цырымоніі ўзнагароджання маладым спартсменам уручылі граматы і памятныя вымпелы, а таксама прыемныя падарункі. На турніры ўшанавалі магілёўскіх рэкардсменаў краіны па эстафетным бегу.

— Апошні турнір па эстафетным бегу ў Магілёве праводзіўся болей за дзясятак гадоў таму, — расказаў **дырэктар спартыўна-юнацкай школы «Марафон» Максім МАЛАХОЎСКІ**. — Мы адрадзілі былую спартыўную традыцыю і хочам на наступны год пашырыць межы турніру і прыцягнуць іншыя беларускія гарады і вобласці.

**Ілона ІВАНОВА.**


Организация: **ОАО «СОТРУДНИЧЕСТВО»**
Учетный номер плательщика: **390185556**
Вид деятельности: **операции с собственным и недвижимым имуществом**
Организационно-правовая форма: **Открытое акционерное общество**
Орган управления: **юридические лица без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн. руб.**
Адрес: **г. Витебск, ул. Зеньковой, д. 1, оф. 1301**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.**

| Актив | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 171 | 258 |
| амортизация | 102 | - | - |
| остаточная стоимость | 110 | 171 | 258 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | - | - |
| амортизация | 112 | - | - |
| остаточная стоимость | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 3 236 | 3 710 |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | 3 236 | 3 710 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **3 407** | **3 968** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 110 | 1 021 |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 1 | 72 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | - | - |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | - | - |
| товары отгруженные | 216 | - | - |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 109 | 949 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 62 | 80 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 26 | 50 |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 241 | - | - |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 13 | 37 |
| по налогам и сборам | 243 | 13 | 13 |
| по расчетам с персоналом | 244 | - | - |
| разных дебиторов | 245 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 4 | 1 |
| В том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | - | - |
| Финансовые вложения | 270 | - | - |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **202** | **1 152** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **3 609** | **5 120** |

| Пассив | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 40 | 40 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | - | - |
| В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | - | - |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 217 | 379 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -22 | -23 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | -53 | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **182** | **396** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 3 350 | 4 718 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **3 350** | **4 718** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Кредиторская задолженность | 620 | 77 | 6 |
| В том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 75 | 4 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | - | - |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 1 | 1 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | - | - |
| по налогам и сборам | 625 | - | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 1 | 1 |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | - | - |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| В том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | - | - |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **77** | **6** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **3 609** | **5 120** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 77 | 6 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 01 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 02 | - | - |
| Материалы, принятые в переработку | 03 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 04 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 05 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 06 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 07 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 08 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 09 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | - | - |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2009 г.**

| Наименование показателей | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | - | - |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | - | - |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | - | - |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | - | - |
| Валовая прибыль (020-021-030) | - | - |
| Управленческие расходы | - | |
| Расходы на реализацию | - | |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **-** | **-** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Операционные доходы | 163 | 2 316 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | - | - |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 163 | 2 316 |
| В том числе: проценты к получению | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | - | - |
| доходы от операций с активами | - | 1 094 |
| прочие операционные доходы | 163 | 1 222 |
| Операционные расходы | 163 | 2 316 |
| В том числе: проценты к уплате | - | - |
| расходы от операций с активами | - | 2 316 |
| прочие операционные расходы | 163 | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **-** | **-** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Внереализационные доходы | - | - |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | - | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | - | - |
| Внереализационные расходы | 1 | 12 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **- 1** | **- 12** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **- 1** | **- 12** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 1 | 12 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **-** | **-** |
| Налог на прибыль | - | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | - | - |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | - | - |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **- 1** | **- 12** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | - | - |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | - | - |

**Ген. директор** **Филипчик И.А.**
**Гл. бухгалтер** **Свидунович О.Э.**


ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292-44-12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# ДАМЫ-ТРАНСФОРМЕРЫ — МАСАВАЕ ЖЫЛЛЁ БУДУЧЫНІ



Дырэктар інстытута Уладзімір ПІЛІПЕНКА.

***Па забяспечанасці жыллём на душу насельніцтва наша дзяржава з'яўляецца лідарам сярод краін СНД. Гэта добры паказчык, але адзнаку «выдатна» беларускаму будаўнічаму комплексу пакуль выстаўляць рана. Толькі летась ён дасягнуў максімальных аб'ёмаў будаўніцтва савецкага часу (было ўзведзена 5,8 мільёна квадратных метраў жылля). Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача да 2011 года выйсці на ўзровень 10 мільёнаў «квадратаў» — гэта прыкладна адзін квадратны метр на чалавека ў год.***

***Шмат нараканняў у спажыўцоў выклікае якасць новабудоўляў і тэрміны іх узвядзення. Гэтыя і іншыя «мінусы» айчыннай будаўнічай галіны былі агучаны на самым высокім узроўні. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў у максімальна сціслыя тэрміны выправіць сітуацыю, правесці работу над памылкамі. Як будаўнікі Беларусі мяркуюць выканаць пастаўленую перад імі — няпростую — задачу: забяспечыць рост аб'ёмаў будаўніцтва жылля, павысіць яго спажывецкія якасці і пры гэтым захаваць цэнавую даступнасць для большасці насельніцтва?***

***Па каментарыі мы звярнуліся да дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут НІПТИС ім. Атаева С.С.», доктара тэхнічных навук, прафесара, замежнага члена Расійскай акадэміі будаўнічых навук, члена-карэспандэнта Міжнароднай інжынернай акадэміі Уладзіміра ПІЛІПЕНКІ.***







**Будынкі Нацыянальнага Вялікага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь і банка Масква–Мінск упрыгожваюць цэнтр беларускай сталіцы. У намаганнях тых, хто праводзіў іх будаўніцтва і рэканструкцыю ёсць уклад калектыву інстытута. На гэтых агульнавядомых аб'ектах ужыты самыя дасканалыя тэхналогіі. Тэхнік Канстанцін ПАЎЛЮЧКОЎ прадэманстраваў для фотаздымка прыборы, з дапамогай якіх праводзяць акустычныя вымярэнні канструкцый гукаізаляцыі.**





**Па распрацоўках інстытута будуецца гэты шматпавярховы дом у Мінску на вуліцы Шафарнянскай. Штодзённая праца супрацоўнікаў навукова-даследчай і выпрабавальніцкай лабараторыі будаўнічай фізікі часткова звязана з тым, каб такія будынкі былі цёплымі. Выпрабаваннямі будаўнічых канструкцый ва ўмовах нізкіх тэмператур заняты інжынер першай катэгорыі Максім ЯНКОВІЧ (на здымку).**

— Рынак жылля, які склаўся ў апошнія гады на Беларусі, сведчыць аб прысутнасці на ім разнастайных канструкцыйна-тэхналагічных сістэм жылых будынкаў, што дазваляе найбольш эфектыўна выкарыстоўваць наяўную рэспубліканскую вытворчую базу і забяспечыць патрэбы ў жыллі розных сацыяльных груп насельніцтва, — патлумачыў Уладзімір Мітрафанавіч.— Такая стратэгія развіцця жыллёвага будаўніцтва вызначана і ў Дзяржаўнай комплекснай праграме развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гады.

Але калі весці гаворку менавіта пра масавае жыллё, то тут стаўка робіцца на развіццё індустрыяльнага будаўніцтва, якое мае значна меншыя тэрміны ўзвядзення ў параўнанні з маналітным і цагляным. Самымі перспектыўнымі відамі індустрыяльнага будаўніцтва сёння з'яўляюцца БПД (буйнапанельнае домабудаванне) і каркасныя канструкцыі са зборнага жалезабетону.

**— Аднак выказваліся меркаванні, што БПД дыскрэдытавала сябе яшчэ ў савецкія часы...**

— У савецкія часы ў Беларусі, а таксама ў іншых савецкіх рэспубліках была выдатна развіта база буйнапанельнага домабудавання. У 1991 годзе буйнапанельныя дамы ў агульным аб'ёме пабудаванага жылля перавышалі 55 працэнтаў.

Пасля развалу СССР у нашай краіне адбылося рэзкае падзенне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва (да 1,5-1,8 мільёна квадратных метраў у 1994-1995 гадах). Апроч гэтага, у наступныя гады пачалі дамінаваць меркаванні аб неабходнасці пераарыентацыі будаўнічага комплексу на каркасныя сістэмы жылых дамоў і жылыя дамы са штучных матэрыялаў (цэгла, газасілікат). Усё гэта прывяло да таго, што сёння на буйнапанельнае домабудаванне прыходзіцца ўсяго 21,5 працэнта ад агульнага аб'ёму жыллёвага будаўніцтва, на каркасныя сістэмы — каля 25 працэнтаў, на жылыя дамы з цэглы — 18 працэнтаў, на іншыя сістэмы — 32,5 працэнта.

Разам з тым, прадэкларааваны ў другой палове 90-х тэзіс аб нізкай цане і высокіх спажывецкіх якасцях цагляных і каркасных жылых дамоў практыкай не пацвердзіўся. Буйнапанельнае жыллё застаецца найбольш танным, а мадэрнізаваныя серыі дамоў БПД, якія цяпер распрацоўваюцца, па камфортнасці набліжаюцца да каркасных і цагляных.

Галоўны мінус старых БПД — жорсткія планіровачныя рашэнні, якія не змяняліся дзесяцігоддзямі. І змяніць іх абсалютна не ўяўлялася магчымым, паколькі яны былі «завязаныя» на той тэхналогіі, якая існавала на заводах буйнапанельнага домабудавання. Так, у трохпакаёвай кватэры кухня была 7,5 квадратнага метра, самі пакоі — па 12, 14 і 18 квадратных метраў. І мы дзесяцігоддзямі вымушаны былі будаваць толькі такі варыянт. Вядома, сёння такое «шаблоннае» жыллё спажыўцоў больш не задавальняе. Людзі хочуць мець індывідуальную планіроўку кватэры, пад заказ, хочуць больш прасторную кухню, шэраг арыгінальных рашэнняў па санітарна-тэхнічным блоку. Не сакрэт, што, атрымаўшы кватэру ў доме БПД, гаспадары часта адразу ж пачынаюць яе перапланіроўваць, хоць у зборным жыллі практычна ўсе сцены — нясучыя і такая самадзейнасць жыльцоў абумоўлівае парушэнні трываласных характарыстык, што ў сваю чаргу можа прывесці да аварый. У новых канструкцыйных сістэмах БПД, якія цяпер распрацоўваюцца, часткова вырашана праблема гібкіх аб'ёмна-планіровачных рашэнняў. Цяпер чалавек зможа заказваць планіровачныя рашэнні індывідуальна па сваёй кватэры.

Яшчэ адзін важны аспект — энергазберажэнне. Тое жыллё, якое мы зараз будуем, пакуль яшчэ даволі энергаёмістае. На ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне яно спажывае каля 90–110 кілават-гадзін на метр квадратны ў год. Гэта многа. Вынікі даследаванняў, якія правёў наш інстытут у плане скарачэння энергазатратаў, былі рэалізаваныя ў праекце энергаэфектыўнага дома па вуліцы Прытыцкага ў Мінску, дзе мы дабіліся паказчыка 30 кілават-гадзін на метр квадратны ў год. Параўнайце: 90 і 30. Розніца адчувальная. Прычым укараненне новых распрацовак абумовіла павелічэнне кошту квадратнага метра такога жылля ўсяго на 8 працэнтаў. Акупаецца энергаэфектыўны дом у сярэднім за 6 гадоў. Падкрэслю, што гэта таксама БПД. Па выніках двухгадовага маніторынгу памянёнага будынка на Прытыцкага нашым інстытутам па даручэнні Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва была распрацавана адпаведная праграма энергаэфектыўнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, якую летась зацвердзіў Савет Міністраў.

**— Дзе-небудзь акрамя Мінска ўжо ёсць такое энергаэфектыўнае жыллё?**

— У мінулым годзе ў рэспубліцы было пабудавана каля 27 тысяч квадратных метраў — у кожнай вобласці з'явіліся такія энергаэфектыўныя дамы. Сёлета аб'ём будаўніцтва энергаэфектыўнага жылля запланаваны ў аб'ёме 300 тысяч квадратных метраў.

**— Патлумачце, калі ласка, за кошт чаго энергаэфектыўны дом забяспечвае такую эканомію энергарэсурсаў?**

— Там мы ўкаранілі адразу некалькі сваіх новых інжынерных рашэнняў. Пачалі з уцяплення абалонкі будынка. Дыферэнцыравалі супраціўленне цеплаперадачы па фасадзе: больш цёплымі зрабілі сцены ў тых частках дома, дзе былі большыя цепластраты (тарцовыя кватэры, кватэры верхняга і першага паверхаў). Цэнтральная ж частка дома нясе менш цепластратаў (бо такія кватэры маюць толькі дзве вонкавыя сцяны), таму і ўцяпленне там не такое грунтоўнае. Яшчэ адно канструктыўнае рашэнне — больш цёплыя вокны (з супраціўленнем цеплаперадачы 1 градус Цэльсія на метр квадратны, падзелены на Ват). І самае галоўнае: мы ўкаранілі прымусовую сістэму вентыляцыі з рэкуперацыяй адпрацаванага цёплага паветра. Справа ў тым, што для выканання санітарных нормаў па паветраабмене мы вымушаныя на метр квадратны жылой плошчы на працягу гадзіны забяспечваць цыркуляцыю трох кубаметраў паветра, у выніку чаго ў дамах страчваецца парадку 55 працэнтаў цяпла. Наша сістэма дазваляе на 80 працэнтаў гэтае цяпло вяртаць назад, абаграваць ім кватэры.

**Малодшы навуковы супрацоўнік Кацярына РУМЫНСКАЯ і загадчык лабараторыі выпрабаванняў сістэм уцяплення Аляксандр САМСОНАЎ рыхтуюцца да выпрабаванняў матэрыялаў.**



**Гэты будынак у Мінску на вуліцы Кахоўскай — прыклад таму, якой сучаснай і прыгожай можа стаць пасля рэканструкцыі старая «пяціпавярхоўка».**



Заўважу, што гэтая сістэма можа праграмавацца ў залежнасці ад рэжыму пражывання канкрэтнай сям'і. Калі, напрыклад, на працягу дня жыльцы ў кватэры адсутнічаюць (дарослыя на працы, дзеці ў школе), то, натуральна, няма неабходнасці забяспечваць паўнавартасны паветраабмен і абагрэў. Тэмпературны рэжым і рэжым вентыляцыі ўдзень могуць быць устаноўлены на адзінку ці нават на нуль, а за гадзіну да прыходу сістэма аўтаматычна ўключаецца. Зручна, што сістэма аўтаномная па кожнай кватэры, і кожная сям'я можа выставіць той рэжым, які для яе будзе аптымальным.

Яшчэ адна праблема, якую сістэма прымусовай вентыляцыі дазваляе вырашыць, — гэта паляпшэнне якасці паветранага асяроддзя ў памяшканнях. Апошнім часам вельмі шмат скаргаў паступае ад жыхароў новабудоўляў на грыбок, на мокрыя сцены, на кандэнсат на вокнах. Справа ў тым, што ў дамах са старой сталяркай інфільтрацыя паветра ажыццяўляецца за кошт няшчыльнасці прылягання рамы і шкла. А калі ўстанаўліваюцца герметычныя вокны, вентыляцыя фактычна знікае, што і абумоўлівае павышаную вільготнасць і канцэнтрацыю вуглякіслага газа ў кватэрах, грыбок на сценах. Мы рэкамендуем прыадчыняць вокны, ставіць адпаведныя клапаны, аднак мала хто з жыльцоў гэта выконвае. Наша новая сістэма дазваляе ўсе гэтыя праблемы вырашыць. Акрамя таго, яна яшчэ забяспечвае якасць паветранага асяроддзя, вырашае праблему ГДК (гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі шкодных рэчываў у паветры). У цэнтральнай частцы буйных гарадоў узровень канцэнтрацыі значна перавышае норму, таму звыклае для нас праветрыванне кватэр на ніжніх паверхах прыносіць не свежае паветра, а шкодныя выхлапы. Дзякуючы нашай сістэме, свежае паветра ў такія кватэры можна падаваць літаральна з даху. Плюс абавязковая сістэма фільтраў, якая адсякае пыл.

Усе гэтыя тэхнічныя новаўвядзенні дазваляюць забяспечваць якасць паветранага асяроддзя ў памяшканні і вырашыць праблему зніжэння ўзроўню энергаспажывання. Мяркуецца, што такая сістэма будзе ўкараняцца ў масавым індустрыяльным жыллі.

**— А што наконт архітэктурных рашэнняў? Савецкія БПД вылучаліся мінімалісцкім дызайнам і не мелі выразнасці. У гэтым плане БПД новага пакалення будуць адрозніваццa ад сваіх старых субратоў?**

— Канешне. Перад праекціроўшчыкамі была пастаўлена задача — пры фарміраванні вонкавых сцен будынкаў ствараць умовы для рэалізацыі рознай фактуры (пад цэглу, пад «рваны» камень, пад афарбоўку). Гэтая задача на сёння фактычна вырашана і цяпер будзе рэалізоўвацца пры праектаванні і будаўніцтве. Але пры гэтым усё роўна трэба трымаць у полі зроку пытанне кошту квадратнага метра. Мы ж разумеем, што чым больш архітэктурных вытанчанасцяў, тым даражэй жыллё. Тут варта шукаць залатую сярэдзіну.

**— Такія дамы мала нагадваюць савецкія панельныя шматпавярховікі. На іх абавязкова будзе попыт...**

— Даследаванні, эксперыментальныя і праектна-канструктарскія работы, выкананыя ў Беларусі, а таксама практыка ўдасканалення тэхналогіі мадэрнізацыі канструктыўна-тэхналагічных сістэм жылых будынкаў БПД у краінах Заходняй Еўропы, Скандынавіі і Расіі сведчаць пра тое, што гэты від індустрыяльнага будаўніцтва ў бліжэйшай перспектыве застанецца запатрабаваным. У краіне і за мяжой створаны новыя канструктыўна-тэхналагічныя сістэмы, якія дазваляюць рэалізаваць прынцып гібкай планіроўкі ўнутранай прасторы будынкаў, знізіць на 25-30 працэнтаў матэрыялаёмістасць і ў 2-2,5 разы — эксплуатацыйныя затраты.

**— Я так разумею, што ўсе новаўвядзенні ў дамах БПД напрамую завязаны на мадэрнізацыі будаўнічых камбінатаў?**

— Безумоўна. І тут адначасова вырашаюцца дзве маштабныя задачы: мадэрнізацыя старых серый буйнога панельнага домабудавання жылля і мадэрнізацыя саміх камбінатаў. Да 2008 года магутнасці прадпрыемстваў ДБК і БПД (па прычыне незапатрабаванасці ў папярэднія гады, недахопу сродкаў на рамонт і замену тэхналагічнага абсталявання) скараціліся больш чым на 1074 тысячы квадратных метраў, ці на 56 працэнтаў. Некаторыя заводы ўвогуле былі закрыты. На сёння магутнасць ДБК складае каля 1500 тысяч квадратных метраў у год.

Мадэрнізацыя камбінатаў праводзіцца ў кірунку ўкаранення гібкіх тэхналогій, якія дазваляюць без асаблівых цяжкасцяў переналадзіць вытворчасць пад любую канструктыўную сістэму.

**— А ці ёсць камбінаты, якія ўжо завяршылі сваю мадэрнізацыю?**

— Цяпер ідзе стадыя пуску-наладкі абсталявання і асваення канструктыўных сістэм на Гомельскім домабудаўнічым камбінаце. Ён у гэтым плане з'яўляецца лідарам. Не адстаюць ад яго Магілёўскі і Віцебскі камбінаты.

**— На час мадэрнізацыі камбінаты спыняюць вытворчасць?**

— У тым і складанасць, што не спыняюць. У асабліва напружанай сітуацыі апынуўся Віцебскі домабудаўнічы камбінат. Там мантаж абсталявання праводзіўся ў тых жа цэхах, дзе ішла і сама вытворчасць. На час мадэрнізацыі камбінат не знізіў аб'ёмы вытворчасці, пры гэтым вёў дэмантаж старога абсталявання, праводзіў мантаж новага і паралельна вёў праектаванне. Гэта была вельмі складаная работа, падчас якой узнікала шмат праблем (напрыклад, не заўсёды габарыты новага абсталявання ўпісваліся ў цэхі, паколькі там яшчэ працавала і старое абсталяванне). Усе гэтыя тэхнічныя моманты вельмі ўскладнілі рэканструкцыю. У Гомелі і Магілёве было прасцей, бо там меліся вольныя плошчы і мадэрнізацыя ў асноўным вялася на іх.

**— Калі плануецца завяршэнне мадэрнізацыі ДБК?**

— Усяго ў краіне сёння 14 домабудаўнічых камбінатаў, 8 з іх падпарадкаваныя Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва, астатнія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці. Я магу гаварыць толькі аб прадпрыемствах, падпарадкаваных міністэрству. У наступным годзе плануецца цалкам завяршыць іх рэканструкцыю.

**— Гаворачы пра індустрыяльнае будаўніцтва, нельга не ўзгадаць канструкцыі са зборнага жалезабетону...**

— Сапраўды. У нас у Беларусі канструктыўная сістэма на базе зборнага каркаса пакуль рэалізуецца ў такім варыянце: зборны каркас і штучны матэрыял для вонкавых сцен і перагародак. Нашаму інстытуту міністэрствам пастаўлена задача распрацаваць цалкам зборны варыянт, які б фактычна набліжаўся да БПД. Гэта вонкавыя сцены з панеляў і перагародачныя ўнутраныя модулі. Фактычна гэта і ёсць цалкам зборны каркас. Перавагай гэтай сістэмы перад старым жыллём з'яўляецца тое, што яна забяспечвае гібкасць аб'ёмна-планіровачных рашэнняў. А значыць, можна будаваць кватэру з планіроўкай пад заказ. Улічваючы аб'ёмы дзяржаўнай падтрымкі ў крэдытаванні грамадзян, мы робім наступныя планіровачныя рашэнні: 40-45 квадратных метраў аднапакаёвая кватэра, 60 квадратаў — двухпакаёвая і да 80 квадратных метраў — трохпакаёвая. Большасць гэтых сістэм дазваляе ўзводзіць і камерцыйнае жыллё (калі ў чалавека ёсць грошы, ён можа заказаць кватэру і 200 «квадратаў», і шматузроўневую).

**— Вернемся ўсё ж да масавага тыпавога жылля. Калі параўнаць БПД і каркаснае зборнае жыллё, ці ёсць паміж імі адчувальная для спажыўца розніца?**

— Што да камфорту — ніякай. Што датычыцца камунальных расходаў, мы ж цяпер пераходзім на энергазберагальныя тэхналогіі, таму па цеплатэхніцы, па энергетыцы яны будуць адпавядаць адным і тым жа стандартам. Цяпер праводзіцца карэкціроўка нарматыўнай базы краіны ў бок памяншэння нормаў расходаў энергарэсурсаў. З 1 студзеня 2011 года пры праектаванні будынкаў энергаэфектыўнага жылля будзе закладацца расход энергарэсурсаў на ўзроўні 70 кілават-гадзін на метр квадратны ў год. З 2012 года — 60 кілават-гадзін на метр квадратны ў год. А ў далейшай перспектыве мы пяройдзем на 40 кілават-гадзін. У першым сваім энергаэфектыўным доме па Прытыцкага мы ўжо дасягнулі паказчыка 30 кілават-гадзін, што адпавядае еўрапейскім стандартам.

**— Мы з вамі вядзём размову пра новае жыллё, але ж у нас у краіне вялікі працэнт старога жылога фонду. І ўвесь яго знесці не атрымаецца. Як яго можна мадэрнізаваць?**

— Масава яго, вядома, ніхто зносіць не будзе. Мы не настолькі багатыя, каб зносіць усё старое неэнергаэфектыўнае жыллё (яго, між іншым, у краіне каля 165 мільёнаў квадратных метраў, пры тым што ўвесь жылы фонд краіны сёння складае 240 мільёнаў). Варта ўлічваць і еўрапейскі вопыт. Тыя ж немцы вельмі асцярожна і абачліва ставяцца да свайго старога жылля. Мы, напрыклад, цяпер наракаем на «хрушчоўкі», але ў свой час гэтае жыллё было камфортным і адпавядала ўсім тагачасным нормам і патрабаванням. Колькі было радасці, калі людзей з баракаў, з зямлянак, з камуналак перасялялі ў асобныя кватэры з каналізацыяй, з цэнтральным ацяпленнем, з кухняй. Я бачыў жыллё значна горшае па планіровачных рашэннях у Германіі, у раёне Франкфурта-на-Майне. Яго рэканструявалі, і нават сярод немцаў знайшліся пэўныя сацыяльныя групы і катэгорыі, якіх такое жыллё задавальняе (мігранты, адзінокія пенсіянеры, маладыя сем'і). У нас рэканструяваныя хрушчоўкі таксама будуць карыстацца попытам. Такое жыллё можна і неабходна рэканструяваць і капітальна рамантаваць. Адзначу, што справа тут не абмяжоўваецца ўцяпленнем. Вопыт дома па вуліцы Кахоўскай, 60 у Мінску паказаў, што можна змяніць і планіровачныя рашэнні. Мы павялічылі шырыню корпуса будынка, надбудавалі дадатковыя паверхі, павялічылі памеры кухняў, ліквідавалі прахадныя пакоі. Завяршылі капітальным рамонтам. Іншая рэч, што ўсё гэта неабходна рабіць у сціснутыя тэрміны, а не так, як атрымалася там, калі грошы выдаткоўваліся з перапынкамі і жыльцоў проста замучылі, бо работы вяліся без адсялення. У прынцыпе, у нас ёсць тэхналогіі, якія дазваляюць зрабіць рамонт цэлага пад'езда ўсяго за тыдзень. Гэта абсалютна рэальна, адзінае пытанне — фінансаванне.

Паўтару: старое панельнае жыллё трэба аднаўляць, капітальна рамантаваць і эксплуатаваць далей. Трываласныя характарыстыкі нясучых канструкцый такіх будынкаў здавальняючыя і могуць эксплуатавацца яшчэ 50, а ў асобных выпадках і да 100 гадоў. Пра гэта сведчаць і нямецкія даследаванні, і расійскія. Зразумела, асобныя жылыя дамы на дарагіх плошчах, напрыклад, у цэнтральнай частцы горада, трэба будзе знесці. Гэтае пытанне трэба вырашаць з улікам размяшчэння мікрараёна. Трэба распрацоўваць бізнэс-план рэканструкцыі мікрараёна — з улікам магчымасці ўшчыльнення забудовы, наяўнасці энергетычных магутнасцяў, наяўнасці інвестараў. І ўжо зыходзячы з гэтага, вырашаць — што зносіць, што рэканструяваць, наколькі ўшчыльняць, дзе надбудоўваць і г.д. На кожны мікрараён варта ствараць асобны бізнэс-план, дзе ўлічваць усе яго асаблівасці, і потым па кожным будынку прымаць асобнае рашэнне. Гэта наша пазіцыя, якая супадае і з палітыкай міністэрства.

**— Пачынаючы з 1 студзеня гэтага года новыя будынкі праектуюцца па еўранормах. Па забеспячэнні надзейнасці і трываласных характарыстыках, у плане энергаэфектыўнасці яны значна адрозніваюцца ад старога жылля. Але пры гэтым кошт квадратнага метра такіх будынкаў, натуральна, будзе большым. Як гэта ўвязаць з задачай павелічэння аб'ёмаў будаўніцтва даступнага жылля? За кошт чаго можна будзе зэканоміць, каб не зрабіць квадратны метр для спажыўца залатым?**

— Гэта вельмі складанае пытанне. Праблему можна вырашыць за кошт рацыянальнага выкарыстання матэрыялаў і прадуманых планіровачных рашэнняў (чым большы памер будынка, тым меншыя ўдзельныя затраты на квадратны метр), за кошт новых тэхналогій, новых механізмаў і інш. Тут трэба скрупулёзна пралічыць усе аспекты. Мы прынялі рашэнне аб укараненні еўранормаў, але гэта патрабуе значных затрат і часу. Пераход да еўранормаў абумоўлівае ўдасканаленне тэхналогій, укараненне новых машын і механізмаў, распрацоўку новых канструктыўных сістэм, навучанне персаналу. Мы разгарнулі шырокамаштабную работу ў гэтым плане, аднак працэс гэты доўгі. Немцы, напрыклад, працуюць у гэтым кірунку ўжо два дзесяцігоддзі.

**— Будынак — гэта не толькі ідэя праекціроўшчыкаў і матэрыялы, але і якасць саміх будаўнічых работ, прафесіяналізм тых, хто гэты будынак узводзіць. Ці адпавядае ён тым высокім патрабаванням, якія сёння да яго прад'яўляюцца?**

— Шмат нараканняў на работу будаўнічага комплексу ў цэлым было з боку кіраўніка дзяржавы. Пытанні прафесіяналізму рабочых займаюць тут не апошняе месца — разам з праблемай кантролю, павышэннем якасці праектаў і г.д. Тут ёсць што ўдасканальваць, і такая задача пастаўлена. На ўсіх узроўнях прайшоў шэраг нарадаў, прысвечаных павышэнню якасці работы будаўнічай галіны, дзе разглядаліся ўсе аспекты (пытанне вытрымлівання нормаў, прымянення якасных матэрыялаў, новых тэхналогій, удасканалення нарматыўнай базы і г.д.). Цяпер прымаюцца адпаведныя рашэнні — арганізацыйныя, тэхнічныя, эканамічныя.

**— І ўсё ж, якім будзе наша тыпавое жыллё гадоў праз 10?**

— Яно будзе энергаэфектыўным, камфортным — у плане забеспячэння якасці паветранага асяроддзя, тэмпературы ўнутры памяшкання, магчымасці рэгулявання тэмпературна-вільготнаснага рэжыму. Жыллё будзе абсталявана перадавымі інжынернымі сістэмамі. І будзе мець зусім іншую архітэктурную выразнасць. Такое жыллё будзе радаваць чалавека, а не прыгнятаць яго сваёй шэрай аднастайнасцю. І яшчэ адзін момант. Мы зараз працуем у новым цікавым кірунку, шукаем спосабы, як з мінімальнай працаёмкасцю весці рэканструкцыю і мадэрнізацыю старога жылля з улікам змяненняў патрабаванняў, якія прад'яўляюць спажыўцы і грамадства да якасці жылля (вы ж разумееце, што кожнае новае пакаленне выпрацоўвае свае патрабаванні). У перспектыве трансфармаваць жыллё можна будзе за кошт новых канструктыўных сістэм будынкаў, можна будзе змяняць інжынерныя сістэмы і нават фасады будынкаў без значных затрат. У гэтым кірунку мы і працуем.

**Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Ліцэнзія № 0530085, выдадзеная Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва да 14.04.2014 г. УНП 100230613.*



**Гэты будынак расце на мінскай вуліцы Судмаліса. Асобна сфатаграфавана месца, дзе жалезабетоннае перакрыцце паміж газасілікатнымі блокамі ўцяпляецца згодна з разлікамі. Такая аперацыя значна зніжае пранікненне холаду ў кватэры.**

**Інжынер-метролаг Ігар ГАРАДЗЁНАК за вызначэннем характарыстык дэфармацыі цеплаізаляцыйных матэрыялаў.**











**Лабаранта Дзмітрыя ЧАХУТУ (на здымку злева) фотааб'ектыў убачыў падчас выпрабавання трываласці змацавання слаёў тынкоўкі і ўцяплення. Загадчык лабараторыі старшы навуковы супрацоўнік Сяргей ДАНІЛЕЎСКІ (на здымку справа) сфатаграфаваны каля лініі для вымярэння прадукцыйнасці вентыляцыйных сістэм. Гэтыя фотаздымкі адлюстроўваюць усяго два моманты з вялікай колькасці доследаў, якія праводзяць супрацоўнікі інстытута дзеля стварэння новага праекта. Але не толькі новабудоўлі становяцца аб'ектамі ўвагі навукоўцаў — часам дзеля вызначэння надзейнасці або перад чарговым рамонтам даследуюць даўно ўзведзенае. Прыклад гэтаму — адзін са старых архітэктурных сімвалаў Мінска — брама парка імя Горкага.**